

ЧАМУ ПЛАКАЦЬ КАРЫСНА ЎСІМ ДЗЕЦЯМ

Сямейная газета

НЕБАНАЛЬНЫЯ ПАДАРУНКІ НА 8 САКАВІКА



Сямейная газета



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 САКАВІКА 2023 г. ЧАЦВЕР № 41 (29921)


## КОРАТКА

• **Аб'яўлена анлайн-галасаванне па вызначэнні найлепшай распрацоўкі праекта «100 ідэй для Беларусі».**

• Пераможцамі ўніверсітэцкіх алімпіяд прызнаны 820 навучэнцаў Беларусі.

• **«Белавія» змяніла ўмовы правозу спартыўнай амуніцыі.**

• Пасяджэнне Савета міністраў абароны АДКБ адбудзецца 25 мая ў Мінску.

• **Канцэрн «Беллеспаперапрам» за мінулы год паставіў прадукцыю ў 69 краін.**

• Ваенна-патрыятычны клуб «Ратавальнік» адкрылі ў Магілёве.

• **Генпракуратура аб'явіла конкурс для навучэнцаў і студэнтаў «Помніць. Шанаваць. Не дапусціць».**

• Казахстан ліквідаваў бар'ер, звязаны з патрабаваннямі да транспартных сродкаў з ЕАЭС.

• **Мытнікі пачалі выконваць функцыі органаў пагранічнай службы ў пункце пропуску «Прывалка».**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар БРЫЛО, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«Па выніках 2022 года Беларусь паставіла ў Кітай прадуктаў харчавання на суму звыш $500 млн. Гэта рост больш як на 40 працэнтаў. Кітай — вялізная краіна. І хоць мы шэсць апошніх гадоў істотна дабаўляем, але гэта ўсё роўна не тыя лічбы. На бягучы год мы паставілі амбіцыйную задачу падысці да $900 млн. Думаю, мы з ёй справімся».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «У ВАС ЁСЦЬ У ЦЭНТРЫ ЕЎРОПЫ МІРНАЯ, СПАКОЙНАЯ БЕЛАРУСЬ»

## Чым адметны візіт Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай

**Цырыманіяльныя фанфары, марш ганаровай варты, выкананне гімна нашай краіны — усе гэтыя атрыбуты суправаджалі дзяржаўны візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай. Бо і статус візіту — найвышэйшы ў дыпламатычнай класіфікацыі.**

**У тым ліку і таму ён не застаўся незаўважаным без перабольшання ва ўсім свеце. Паездку беларускага лідара ў Кітай згадалі вядучыя інфармагенцтвы, тэлеканалы і выданні. Можна сцвярджаць, не баючыся памыліцца, што незаўважанымі не засталіся і словы Старшыні КНР Сі Цзіньпіна: «Мяне са спадаром Прэзідэнтам аб'ядноўвае агульнае імкненне да развіцця кітайска-беларускіх адносін. Мы сябруем ужо не першы год. У нас трывалае непарушнае сяброўства. Ва ўмовах нестабільнасці і турбулентнасці міжнароднай абстаноўкі Кітай актыўна настроены на працяг сумесных намаганняў з Беларуссю па ўмацаванні палітычнага ўзаемадаверу, супрацоўніцтва ў інтарэсах дынамічнага, здаровага і ўстойлівага развіцця двухбаковых адносін», якія можна назваць лейтматывам усяго візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Паднябесную.**

**А быў ён сапраўды насычаным, аб чым сведчыць і вышэйшы ўзровень сустрэч з Прэзідэнтам Беларусі ў Пекіне.**



Фота БелТА

### Інтэнсіфікаваць адносіны на карысць народаў

На сустрэчы з Прэм'ерам Дзяржсавета КНР Лі Кэцянам кіраўнік дзяржавы падзякаваў кітайскаму боку за каласальную дапамогу і падтрымку беларускаму народу і краіне. Ён адзначыў, што на пасадзе Прэзідэнта гэта яго 13-ы візіт у Кітай. У свой час менавіта ў Кітаі пераймалі вопыт па шэрагу напрамкаў, у першую чаргу ў пытанні стварэння свабодных эканамічных зон. «Мы ўсё найлепшае (30 гадоў таму пачалі гэты працэс) пераймалі ў вас. Мы шмат зрабілі з таго часу. І жамчужынай, вянцом нашых адносін стаў (індустрыяльны парк. — **Заўв. БелТА.**) «Вялікі камень» — буйны міжнародны праект, які мы са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам адкрылі пад Мінскам. І ён назваў гэты праект жамчужынай Шаўковага шляху, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Тады я сказаў, што мы ніколі не застанёмся ў даўгу перад вялікім кітайскім народам».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што пры непасрэдным удзеле Лі Кэцяна бакі дасягнулі практычна немагчымага. Раней краіны марылі аб $5 млрд тавараабароту. Сёння ж гэты паказчык практычна ўжо дасягнуў $6 млрд і працягвае расці. «У нас няма закрытых тэм для супрацоўніцтва. Мы супрацоўнічаем па ўсіх напрамках. І, самае галоўнае, мы ніколі не ставілі перад сабой задачу, каб дружыць і працаваць супраць трэціх краін, каго б там ні было. Мы робім усё ў інтарэсах сваіх народаў — беларускага і кітайскага. Так будзе і надалей», — запэўніў беларускі лідар.

«Мы вам жадаем поспехаў. У гэтым наш прагматызм. Таму што будзе моцным Кітай — будзе моцнай і будзе развівацца і наша Беларусь, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — У нас прапаноў шмат, планаў вельмі шмат, якія будуць выгадныя і Беларусі, і Кітаю. Але галоўнае ў тым (я яшчэ Цзян Цзэміну гаварыў пра гэта, потым Ху Цзіньтаа), што ў вас ёсць у цэнтры Еўропы мірная, спакойная Беларусь. Давайце разам будзем інтэнсіфікаваць нашы адносіны на карысць нашых народаў. Там няма закрытых тэм для вас, няма закрытых рэгіёнаў. Прыязджайце, будзем супрацоўнічаць. Наша дружба стала ўсепагоднай, усеабдымнай. І ў гэтым ключы мы гатовыя дзейнічаць і ісці насустрач кітайскаму народу».

### Стратэгічнае супрацоўніцтва на міжнароднай арэне

Прэзідэнт Беларусі таксама сустрэўся са Старшынёй Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Лі Чжаньшу.

У размове з ім беларускі лідар падкрэсліў: «Кітай стаў глабальнай дзяржавай. Без Кітая сёння немагчыма вырашыць ніводнае пытанне на нашай планеце. Кітай — прыхільнік шматпалярнага свету. Такую ж палітыку праводзім і мы. І наогул палітыка як унутры Кітая, так і ўнутры Беларусі падобная. Міжнародны парадак дня намі цалкам падтрымліваецца. Мы дзейнічаем у адным ключы».

СТАР. 2

Сяўба

# ЗЯМЛЯ СПЕШКІ НЕ ЛЮБІЦЬ

**У сельгаспрадпрыемствах Віцебшчыны гарачая пара: не на полі, а на мехдварах шчыруюць над тэхнікай механізатары і слесары, падрыхтоўваюць машыны і пасяўныя агрэгаты да новага сезона. Прыказка «Ладзь калёсы зімою...» на некалькі месяцаў становіцца для аграрыяў своеасаблівым прафесійным крэда. Мы завіталі ў вытворчы кааператыў «Альгоўскае», што ў Віцебскім раёне, і даведаліся аб планах гаспадаркі на будучую вясну.**

На календары ўжо афіцыйна другі вясновы дзень, але сёлетняя зіма ніяк не хоча саступаць сваё месца і закідвае снягамі Віцебшчыну. І хоць на Брэстчыне гаспадары на ўласных падворках збіраюцца ў хуткім часе садзіць бульбу, у паўночным рэгіёне пасяўной не відаць і на гарызонце — матухна-зямля яшчэ спачывае пад тоўстай снегавой коўдрай. Вось у аграрыяў і ёсць у запасе яшчэ крыху часу, каб давесці да ладу кожную адзінку тэхнікі.

На сённяшні дзень гатоўнасць трактарнага парка вобласці складае звыш 90 працэнтаў, у некаторых раёнах гэты паказчык вышэйшы, у некаторых — ніжэйшы, аднак сёлета райвыканкамы больш актыўна выдзяляюць сродкі з мясцовых бюджэтаў на падтрымку сельгасвытворцаў, што і дае добры вынік: задача адрамантаваць 95 працэнтаў энерганасычаных трактароў будзе выканана. З пачатку года на рамонт тэхнікі ў Віцебскай вобласці з усіх крыніц было накіравана каля васьмі мільёнаў рублёў.

СТАР. 4



Трактарыст-машыніст Дзмітрый ГАПОНЕНКА.

ISSN 1990 — 763X

23041

# «У ВАС ЁСЦЬ У ЦЭНТРЫ ЕЎРОПЫ МІРНАЯ, СПАКОЙНАЯ БЕЛАРУСЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ён асабліва адзначыў, што нядаўнія прапановы Старшыні КНР аб мірным развіцці на планеце, недапушчэнні санкцый, развіцці добрасуседства цалкам супадаюць з пазіцыяй Беларусі.

«Мы вельмі высока цэнім цеснае стратэгічнае супрацоўніцтва з вашай краінай на міжнароднай арэне. Нашы краіны нязменна аказваюць падтрымку адна адной па важных ключавых пытаннях сусветнага парадку дня. Мы асуджаем дзеянні, накіраваныя на ўзмацненне напружанасці вакол Тайваня. Беларусь заўсёды прытрымлівалася прынцыпу «аднаго Кітая», выступала за мірнае вырашэнне і катэгарычна супраць умяшання замежных дзяржаў ва ўнутраныя справы КНР. Мінск падтрымліваў і будзе падтрымліваць Пекін па ўсіх адчувальных пытаннях. У тым ліку па Сіньцзяну, Паўднёва-Кітайскім моры, Ганконгу і Тайваню», — запэўніў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка асабліва адзначыў, што міжпарламенцкія кантакты з'яўляюцца значным фактарам развіцця беларуска-кітайскіх адносін. Кіраўнік дзяржавы заявіў, што намечанае пераўтварэнне групы дружбы паміж парламентарыямі ў міжпарламенцкую камісію высокага ўзроўню стане стымулам для ўмацавання і інтэнсіфікацыі супрацоўніцтва. «Мы зацікаўленыя ў арганізацыі ўзаемных візітаў па парламенцкай лініі і заўсёды чакаем вас у Мінску», — сказаў Прэзідэнт.

Ён таксама падзякаваў за падтрымку прапановы беларускага боку наконт семінара жанчын-парламентарыяў, круглага стала па маладзёжнай палітыцы. «Спадзяюся, вы будзеце браць удзел у гэтых мерапрыемствах», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка згадаў і аб змяненнях у Канстытуцыю Беларусі, у адпаведнасці з якімі УНС быў нададзены канстытуцыйны статус. У свеце няма аналагаў дадзенай структуры, але, як адзначыў Прэзідэнт, яна падобная да Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў.

У сваю чаргу, Старшыня Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Лі Чжаньшу цёпла прывітаў беларускага лідара. Ён адзначыў, што бягучы год у Беларусі аб'яўлены Годам міру і стваральнай працы, што пацвярджае няўхільнае імкненне краіны да міру і развіцця. «Упэўнены, што пад Вашым верным кіраўніцтвам абавязкова будуць новыя вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця на карысць беларускага народа. Двухбаковыя адносіны паміж Беларуссю і Кітаем развіваюцца ў здаровым і стабільным рэчышчы. Асабліва ў апошняе дзесяцігоддзе пад стратэгічным кіраўніцтвам Сі Цзіньпіна і Вас кітайска-беларускія адносіны развіваюцца з вялікай дынамікай. Яны выйшлі на гістарычна высокі ўзровень усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства», — сказаў ён.

«Пашырэнне кантактаў з Кітаем для нас — прыярытэт у знешняй палітыцы», — заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы, падкрэсліўшы, што ўсепагодны характар двухбаковага супрацоўніцтва дае магчымасць Беларусі і Кітаю рухацца далей.

### Новы статус адносін павінен дапаўняцца новым зместам

Галоўнай падзеяй дзяржаўнага візіту Прэзідэнта былі, несумненна, перагаворы са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам, падчас якіх былі абмеркаваныя вектары далейшага супрацоўніцтва.

«Мы зацікаўленыя ў паглыбленні супрацоўніцтва з Кітаем па тэхналагічным развіцці, уключаючы стварэнне сумесных вытворчасцяў, мадэрнізацыю беларускіх прадпрыемстваў з укараненнем сучасных кітайскіх тэхналогій, прасоўванне тавараў і паслуг на рынкі трэціх краін», — сказаў беларускі лідар.

Ён адзначыў, што патэнцыял двухбаковых праектаў велізарны. «Нашы вытворцы зацікаўленыя ў вывучэнні кампетэнцый і тэхналогій кітайскіх кампаній у фарміраванні кампанентнай базы, выпуску рухавікоў, трансмісій, мастоў, іншых вузлоў і агрэгатаў. Прапаную стварыць сумесныя прадпрыемствы ў галіне станкабудавання, электратранспарту, вытворчасці дэталяў для сельскагаспадарчай тэхнікі як у Беларусі, так і ў Кітаі. Кааперацыя дапаможа павысіць канкурэнтаздольнасць прадукцыі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.



Фота БелТА

На перагаворах Прэзідэнт агучыў і шэраг іншых прапаноў, якія ідуць у рэчышчы сумеснай работы ў галіне сацыяльна-эканамічнага развіцця і мадэрнізацыі.

«Сённяшняя сустрэча праходзіць у вельмі няпросты час, які патрабуе новых нестандартных падыходаў і адказных палітычных рашэнняў. Яны мусяць быць накіраваны перш за ўсё на недапушчэнне глабальнага процістаяння, у якім не будзе пераможцаў. Вы аб гэтым дакладна, адназначна, пунктуальна нядаўна заявілі, звяртаючыся да сусветнай супольнасці. Менавіта таму Беларусь актыўна выступае з прапановамі аб міры, цалкам падтрымлівае вылучаную вамі ініцыятыву аб міжнароднай бяспецы», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Ён адзначыў, што з беларускім бачаннем таксама поўнасцю супадае ініцыятыва Сі Цзіньпіна па тэматыцы развіцця. «Мы адразу ж далучыліся да механізму па яе пашырэнні і гатовыя да сумеснай падрыхтоўкі і рэалізацыі праектаў у Беларусі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама ён павіншаваў Сі Цзіньпіна з найвялікшым даверам кітайскага народа на з'ездзе Кампартыі Кітая. «Паважаны Старшыня, дарагі сябар беларускага народа. Перш за ўсё чарговы раз хачу павіншаваць цябе з найвялікшым даверам кітайскага народа. У сваім віншаванні ад імя Прэзідэнта Беларусі, маёй сям'і я сумленна выказаўся аб тым, што мы вельмі перажывалі за поспех чарговага з'езда Камуністычнай партыі Кітая. Мы вельмі хваляваліся. Хоць можна было і не хвалявацца. Але, тым не менш, за сяброў заўсёды хвалюешся. І я хачу ад імя беларускага народа, ад сваёй невялікай сям'і, сябе асабіста павіншаваць майго сябра Сі Цзіньпіна з выбраннем Старшынёй КНР», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, зыходзячы са свайго вопыту, пасля такіх маштабных рашэнняў напярэдадні вельмі шмат работы: «Жадаю вам, вашым калегам дастойна прайсці гэты перыяд. І жадаю поспехаў у развіцці рашэнняў з'езда Камуністычнай партыі Кітая».

Прэзідэнт падкрэсліў, што шчыра рады зноў наведаць дружалюбны Кітай. «Кожны раз для мяне гэта не толькі новае адкрыццё вашай самабытнай краіны, яе культуры, народа. Гэта яшчэ і магчымасць назіраць каласальныя змяненні ў развіцці, пераймаць унікальны вопыт, вучыцца ў вас», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падзякаваў кітайскаму лідару за традыцыйна цёплы прыём, аказаны ўсёй беларускай дэлегацыі, чым заўсёды вызначаўся Кітай.

У сваю чаргу, Сі Цзіньпін, шчыра прывітаўшы Прэзідэнта Беларусі, адзначыў: «Сустрэча паміж даўнімі сябрамі заўсёды толькі радуе. Мы з вамі сустракаліся ў апошні раз летась у верасні ў Самаркандзе. У нас была выдатная размова, падчас якой намі было аб'яўлена аб вывядзенні кітайска-беларускіх адносін на ўзровень усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства, што паслужыла магутным штуршком для поўнамаштабнага супрацоўніцтва дзвюх краін. Новы статус двухбаковых адносін павінен напаўняцца новым зместам. Сёння ў нас добрая магчымасць распрацаваць план па ўсім комплексе двухбаковых адносін і прыняць сумесную заяву».

### Узорныя адносіны ва ўсіх кірунках

Сумесная заява аб асноўных прынцыпах развіцця ўзорных адносін усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства Беларусі і Кітая ў новую эпоху стала вынікам перагавораў кіраўнікоў краін.

Лідары Беларусі і Кітая на перагаворах як у шырокім, так і ў вузкім складзе размаўлялі значна даўжэй за запланаваны час, што відавочна сведчыць аб узаемнай зацікаўленасці ў вырашэнні пытанняў, якія стаяць на парадку дня, і нацэленасці на вынік.

У прысутнасці кіраўнікоў дзяржаў таксама быў падпісаны маштабны пакет дакументаў аб супрацоўніцтве ў розных сферах.

Падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні паміж МЗС Беларусі і Дзяржаўным агенцтвам па міжнародным развіцці і супрацоўніцтве КНР па ўмацаванні супрацоўніцтва ў мэтах развіцця і садзейнічання рэалізацыі Ініцыятывы па глабальным развіцці.

Зацверджаны план Года рэгіёнаў Беларусі і Кітая на 2023 год.

Падпісана праграма беларуска-кітайскага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва на 2023—2024 гады.

Паміж профільнымі ведамствамі Беларусі і Кітая падпісаны пагадненне і мемарандум па супрацоўніцтве ў галіне турызму і спорту.

Заключаны мемарандум аб узаемаразуменні і аб супрацоўніцтве паміж Камітэтам дзяржкантролю Беларусі і Дзяржаўным кантрольна-рэвізійным упраўленнем КНР.

Падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні паміж Мінбудархітэктуры Беларусі і Міністэрствам жыллёвага будаўніцтва і гарадскога і сельскага развіцця КНР.

Заключаны пагадненні аб супрацоўніцтве паміж інфармацыйнымі агенцтвамі Беларусі і Кітая — «БелТА» і «Сіньхуа», а таксама Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніяй Рэспублікі Беларусь і Медыякарпарацыяй Кітая.

У прысутнасці кіраўнікоў дзяржаў таксама падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні па рэалізацыі праектаў супрацоўніцтва з выкарыстаннем ільготных крэдытаў урада Кітая.

Яшчэ адзін мемарандум аб узаемаразуменні фіксуе факт істотнага завяршэння перагавораў па тэксце праекта Пагаднення аб гандлі паслугамі і ажыццяўленні інвестыцый.

Мінэканомікі Беларусі і Міністэрства камерцыі Кітая заключылі пагадненне аб паглыбленні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі дзвюх краін.

У форме абмену пісьмамі заключана міжурадавае пагадненне па зацвярджэнні праекта па пастаўцы для Нацыянальнага аэрапорта «Мінск» абсталявання для нагляду.

Зацверджана комплексная стратэгія сумеснага прамысловага развіцця, якая рэалізоўваецца Мінпрамам Беларусі і Міністэрствам прамысловасці і інфарматызацыі КНР.

Падпісаны пратакол, які датычыцца санітарных і фітасанітарных патрабаванняў пры пастаўцы прадукцыі з Беларусі ў Кітай.

Падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні ў галіне супрацоўніцтва па сельскай гаспадарцы.

Таксама падпісаны план па развіцці супрацоўніцтва ў галіне аховы здароўя на 2023—2025 гады.

Вялікі блок падпісаных дакументаў у рамках дзяржвізіту Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай датычыцца міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, а таксама фінансаў, банкаўскай сферы, інфармацыйнага забеспячэння гандлю і па лініі арганізацыі Чырвонага Крыжа.

**Паводле БелТА.**

## У фармаце дыялогу

# АДЗІН З САМЫХ СКЛАДАНЫХ ПЕРЫЯДАЎ ПАСЛЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

**На сустрэчу са студэнтамі беларускіх ВНУ ў рамках інфармацыйна-асветніцкага праекта «Зачетный разговор», які стартаваў у студзені, прыходзяць вядомыя людзі: палітолагі, журналісты, дэпутаты, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Пагаварыць са студэнтамі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта прыйшоў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА. Ад яго маладыя людзі з першых вуснаў пачулі аб тым, што на сённяшні дзень адбываецца ў краіне і свеце.**

«Калі ацэньваць знешнепалітычную сітуацыю вакол нашай краіны, то яна складваецца даволі няпроста. Напэўна, мы сёння перажываем адзін з самых складаных перыядаў пасля Вялікай Айчыннай вайны. Прычын таму некалькі. Мы бачым сёння, па-першае, мілітарызацыю, якая адбываецца ў суседніх дзяржавах, непасрэдна каля нашых граніц. Практычна архітэктура міжнароднай бяспекі, якая выбудоўвалася ўвесь пасляваенны час, цяпер змяняе канфігурацыю. Сёння нават, мабыць, складана сабе ўявіць, нягледзячы на намаганні, якія робіцца кіраўніцтвам краіны і непасрэдна Прэзідэнтам па правядзенні міралюбівай знешняй палітыкі, як будзе складвацца сітуацыя ў найбліжэйшыя дзесяцігоддзі на знешнім трэку, — сказаў Ігар Сергеенка. — Мы бачым, як сёння нарошчваецца ваенная прысутнасць непасрэдна ўзброеных сіл Польшчы і блока НАТА каля нашых граніц. Актыўна праводзяцца ваенныя вучэнні. Іх інтэнсіўнасць каля нашых граніц таксама значна вырасла за апошнія гады. Мы не бачым відавочнай падрыхтоўкі да нападзення на Беларусь. Але, тым не менш, гэтыя прыкметы гавораць аб тым, што такая падрыхтоўка ажыццяўляецца. Адпаведна, каб супрацьстаяць, мы павінны падтрымліваць узровень сваёй баявой падрыхтоўкі».

Не можа не турбаваць беларусаў і сітуацыя, якая сёння складваецца ва Украіне. «Калі звярнуцца да гісторыі пытання, фактычна падрыхтоўка да баявых дзеянняў з боку Украіны ажыццяўлялася з 2014 года, калі ў краіне адбыўся ваенны дзяржаўны пераварот. І Украіна імкліва пачала свой рух у бок ЕС, блока НАТА. Па сутнасці, пачалі адраджацца рэваншызм, нацыяналізм у самых крайніх формах. Сёння спецыяльная ваенная аперацыя, якая праводзіцца на тэрыторыі Украіны, — гэта фактычна вайна паміж Расіяй і калектыўным Захадам. Тое, што адбываецца на тэрыторыі сумежнай дзяржавы, — не можа не турбаваць нас. Адносна таго, ці ўцягнецца Беларусь. Адказ адназначны, даклады даў Прэзідэнт: мы на тэрыторыі чужой краіны ваяваць не будзем. Але калі нам будзе рэальная пагроза, на нас нападуць — мы таксама дадзім свой адказ», — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

**Паводле БелТА.**

Дзяржаўны інтарэс

# ВІЗІТНУЮ КАРТКУ ДЗЯРЖАВЫ АБНОВЯЦЬ

## Нацыянальны атлас Беларусі будзе перавыдадзены

**Навукоўцы БДУ ўвайшлі ў склад рэдкалегіі па перавыданні Нацыянальнага атласа Беларусі. Узначаліў яе старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір Гусакоў. Адным з намеснікаў галоўнага рэдактара зацверджаны рэктар БДУ Андрэй Кароль. У якасці адказнага рэдактара ўключаны першы прарэктар Дзмітрый Курловіч. Таксама ў склад рэдкалегіі ўвайшлі тры супрацоўнікі факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ.**

Навукоўцам трэба абнавіць паліграфічную версію атласа і стварыць яго электронны варыянт у выглядзе Дзяржаўнай атласнай інфармацыйнай сістэмы (АІС). Над новай рэдакцыяй будзе працаваць каля 40 вучоных. Гэта прадстаўнікі НАН Беларусі, БДУ, Рэспубліканская ўнітарнага прадпрыемства «Белкартаграфія», Навукова-вытворчага цэнтра па геалогіі і іншых. У іх задачу ўваходзіць дапоўніць і абнавіць 19 раздзелаў новага выдання.

Супрацоўнікі БДУ зацверджаны ў якасці навуковых альбо адказных рэдактараў і адказваюць за работу над раздзеламі: «Рэспубліка Беларусь і яе месца ў свеце», «Рэльеф», «Паверхневыя воды», «Ландшафты», «Медыка-геаграфічны стан тэрыторыі», «Насельніцтва», «Прамысловасць», «Сельская гаспадарка», «Транспарт», «Сацыяльная сфера і ўмовы жыцця насельніцтва», «Навука і адукацыя», «Культура, спорт, турызм».

Фундаментальнае навукова-даведачнае выданне будзе змяшчаць больш поўную, абноўленую інфармацыю аб Беларусі, яе тэрыторыях, гісторыі, геалагічнай будове і рэльефе, кліматычных умовах, паверхневых водах, глебах і зямельных рэсурсах, жывёльным і раслінным свеце, экалогіі, насельніцтве, прамысловасці, сельскай гаспадарцы, транспарце, сацыяльнай сферы, навуцы, адукацыі, культуры, спорце, турызме.

Неабходнасць перавыдання і дапаўнення Нацыянальнага атласа Беларусі абумоўлена шэрагам трансфармацый, што адбыліся ў краіне. У прыватнасці, змяніліся межы адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак — раёнаў.

Картаграфічнае выданне з'яўляецца візітнай карткай дзяржавы. Яно дазваляе акумуляваць вынікі шматгадовай работы вучоных і спецыялістаў, якія працуюць у розных сферах. Аўтарам атласа неабходна правесці збор match інфармацыі па вялікай колькасці напрамкаў, усё сістэматызаваць, размеркаваць па частках і раздзелах, а таксама даступна і нагля дна прадставіць навукаёмістую картаграфічную інфармацыю.

Упершыню атлас быў выдадзены ў 2002 годзе і складаўся з 19 раздзелаў. Новае выданне плануецца выпусціць да сярэдзіны 2024 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Соцыум

# ДАПАМАГЛІ 5,7 ТЫСЯЧЫ МІГРАНТАЎ З УКРАІНЫ

## Беларускі Чырвоны Крыж падвёў вынікі работы

**Беларускі Чырвоны Крыж сабраў больш як 130 тысяч рублёў для дапамогі пацярпелым у выніку землятрасення ў Турцыі і Сірыі. Пра гэта, а таксама пра вынікі мінулага года і планы на перспектыву ішла размова на выніковай калегіі прэзідыума арганізацыі за мінулы год.**

Літаральна на наступны дзень пасля землетрасення ў Турцыі быў аб'яўлены надзвычайны заклік Міжнароднай федэрацыі Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца да таварыстваў усіх краін.

— Мы таксама адгукнуліся. Адкрылі свой рахунак у сістэме АРІП, каб кожны чалавек мог ахвяраваць сродкі. Пры дапамозе нашых партнёраў і МНС мы змаглі адправіць груз гуманітарнай дапамогі ў выглядзе коўдраў, спальных мяшкоў, турыстычных дыванкоў у Сірыю і Турцыю. Туды накіраваліся два самалёты з дапамогай. Увогуле мы адправілі гуманітарнага грузу на 100 тысяч рублёў, — расказаў **генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа Дзмітрый ШАЎЦОЎ.**

Як ён адзначыў, мінулы год Беларускі Чырвоны Крыж правёў дастойна.

— Дружнай камандай мы адрэагавалі на розныя выклікі: крызіс на беларуска-польскай граніцы, які працягваецца, новы міграцыйны крызіс на беларуска-ўкраінскай граніцы, работа з мігрантамі, якія да нас масава паступаюць з Украіны, у тым ліку цяпер транзітам праз Польшчу, — расказаў ён.

Летась Беларускі Чырвоны Крыж аказаў дапамогу каля 5,7 тысячы мігрантаў толькі з Украіны. Апрача таго, работнікі арганізацыі працягвалі работу з інвалідамі, адзінокімі пажылымі людзьмі, дзецьмі. У Чырвоным Крыжы ёсць і каманды рэагавання, якія сумесна з работнікамі Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях дапамагаюць шукаць зніклых, аказваюць пасільную дапамогу людзям у крытычных сітуацыях.

— Штогод з МНС праводзяцца сумесныя вучэнні. Летась мы абнавілі нашу матэрыяльна-тэхнічную базу: закупілі пнеўмакаркасныя модулі і цяпер можам разгортваць паўнавартасны палатачны гарадок для 500 чалавек, закупілі 9 аўтамабіляў, з іх — 6 мікрааўтобусаў. Таксама набылі іншае абсталяванне для камандаў хуткага рэагавання. Нашых валанцёраў мы цалкам укамплектавалі, — адзначыў Дзмітрый Шаўцоў.

Сёлетнія планы таксама амбіцыйныя. У 2023 годзе ў Магілёве плануецца адкрыць самы вялікі крызісны цэнтр у краіне. Стаіць пытанне аб магчымасці адкрыцця новага цэнтра ў Гродне, таму што ён быў адкрыты



самым першым і ўжо патрабуе абнаўлення. Па словах генеральнага сакратара, сёлета працягнецца работа з мігрантамі, якія ўжо прыбылі ў Беларусь, і з тымі, хто яшчэ прыбудзе.

— Будзем супрацоўнічаць з МУС і ДПК па нерэгулярных мігрантах, якія затрымліваюцца. Мы забяспечваем іх неабходнымі прадуктамі, адзеннем, правам званка. Развіццё валанцёрства ў нашых крызісных цэнтрах, развіццё нашых сэрвісаў, пашырэнне ахопу маючых патрэбу ў дапамозе, улік нашых памочнікаў — усё гэта першачарговыя задачы Чырвонага Крыжа на 2023 год, — падкрэсліў Дзмітрый Шаўцоў.

**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін,** Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, адзначыў, што служэнне таварыства Чырвонага Крыжа аб'ядноўвае людзей у розных краінах:

— Яно мае старажытную гісторыю і аб'ядноўвае людзей, якія адгукаюцца на боль іншых. Аказанне дапамогі людзям, што жывуць у нястачы, — гэта старажытнае Божае ўстанаўленне. Яшчэ ў Старым Запавеце мы чытаем пра тое, як прарок Майсей прыняў Заканадаўства ад Бога, які кажа пра важнасць дапамогі ўсім, хто мае патрэбу. І ў наш час ёсць вельмі шмат людзей, што маюць патрэбу ў дапамозе. Карысць ад такой дапамогі атрымлівае не толькі той, хто яе прымае, але і той, хто падае.

У наш час кожны чалавек мае патрэбу ў добрым, спагадлівым слове, падтрымцы і добразычлівых адносінах, падкрэсліў патрыяршы экзарх. Калі людзі з добрымі намерамі аб'ядноўваюцца ў рамках Чырвонага Крыжа і аказваюць дапамогу, гэта прыносіць вынікі і прыцягвае Божае благаслаўленне.

**Алена КРАВЕЦ.**

По сутнасці

# ЕЎРАПЕЙСКІ ЦЫРК І КЛОЎНЫ



**«Карцінку» еўрапейскай паліткарэктнасці і дыпламатыі я ацаніў яшчэ ў дзяцінстве. Пачаткоўцам разам са сваім класам быў на экскурсіі. Каля сцен Брэсцкай крэпасці адбылася проста ганебная сітуацыя. Неахайныя еўрапейцы з хітрымі ўсмешкамі раздавалі дзецям мяккія цацкі. Выгляд у падарункаў быў супастаўны з выглядам тых «шчодрых данайцаў», якія іх дарылі. Прызнацца, за гэтым я назіраў з пагардай. Па-першае, выконваў бацькоўскі наказ: з чужых рук нічога не браць. Па-другое, у тым узросце я да канца не разумеў, што ў пачатку 1990-х не ва ўсіх дзяцей было столькі цацак, колькі ў мяне. Яшчэ запомнілася, як акцыю раздачы «гуманітаркі» для ўнукаў пераможцаў каля няскоранай Цытадэлі здымалі заходнія «дабрадзеі».**

Мне здаецца, больш нічога і не патрэбна, каб зразумець, у якой дрыгве мы тады былі. Асабліва важна гэта зразумець тым, хто мроіць аб тым «страчаным» часе альбо аб новым парадку еўрапейскасці. Такі ўжо быў — падчас фашысцкай акупацыі. А вось той урок я вывучыў на ўсё жыццё. Колькі б ні казалі «мадэрновыя» настаўнікі і выкладчыкі пра «вялікую культуру калектыўнага Захаду», колькі б ні навязвалі мас-медыя выключнасць еўрапейскага шляху, колькі б ні агітавалі некаторыя палітыкі і абывацелі за гэты самы шлях, у мяне перад вачыма — тыя дзікаватыя, калі не сказаць дзікунскія, паводзіны чужынцаў каля нашай крэпасці.

Цяпер дзікунскія паводзіны — мейнстрымныя ў ЕС. Памятаеце, як хораша Парламенцкую сесію АБСЕ правялі ў Мінску. Мы нават не зважалі на пакеты іх санкцый, на тое, што нам выдзелілі нейкую лаву злева, у прыцемках, далей ад галоўнай сцэны еўрапейскага парламентарызму. «Усходняе партнёрства» назвалі. Аж брыдка ад усяго гэтага. Ну, мы такія добрыя, лагодныя і гасцінныя. У найлепшых традыцыях сапраўднай хрысціянскай Еўропы? А мо ўсе тыя станоўчыя рысы нацыянальнага характару — спадчына славянскага кода. А Еўропа проста ўдала прыкідвалася. А мы ім яшчэ сваімі рэверансамі балаў надавалі. Але ў постковідным свеце маскарады — палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя — пацярпелі фіяска. Маскі пад нагамі.

Дзесьці на тым жа ўзроўні — ніжэй за плінтус — і палітычная культура еўрадэпутатаў. Я пра пасяджэнне ПА АБСЕ ў самым сэрцы Еўропы — у Вене. На радзіме Штрауса. Вось яна, культура адмены. Такая ганебная «інсталяцыя». Латышскі дэпутат спецыяльна перайшоў на рускую — такую непажаданую ў Прыбалтыцы мову — каб вылаяцца. Так пахабна нават грузчыкі ў партах Латвіі рэдка лаюцца з прычыны дэфіцыту работы. Ёсць у нас рэзкія ютуб-каналы, але і яны такога ніколі сабе не дазваляюць. Іх баняць за праўду, а якія санкцыі (гэта так па-еўрапейску) прымяняць да выбранніка латышскага народа? Так недалёка і да нацыскага дна. Мы — беларусы — вельмі ж міласэрныя, забыліся пра аперацыі карнікаў «Зімняе чараўніцтва», калі рукамі латышскіх калабарантаў было вынішчана да попелу адразу некалькі раёнаў на поўначы Віцебскай вобласці. Зразумела, педантычна кіравалі немцы. А мо і цяпер так было? Венская сесія АБСЕ ператварылася ў фэст лакейства. Пасля латышскага «перформанса», высунуўшы язык на дыстанцыю ганьбы, выйшлі ўкраінскія «майстры палітычнага спектакля». Той жа настрой, тыя ж пасылы. Нездарма народу і падсунулі латышскага «стэндапера». Але гэта было б смешна, калі б не было так сумна. І брыдка.

Пакуль голас афіцыйнага Мінска даводзіў еўрапейскаму бамонду прапісныя ісціны дэмакратыі, за спіну Андрэя Савіных зайшлі два прадстаўнікі Кіева і расцягнулі сваё палотнішча. Мо яны так падтрымалі беларускую пазіцыю? Альбо хацелі «прапіярыцца» на фоне вядомага беларускага дыпламата і дэпутата. Але ж Савіных паказаў жалезную вытрымку і прадэманстраваў свету дастойныя паводзіны. Як ужо колькі гадоў запар робіць наша краіна. Так, гэта наша дыпламатычная школа — ад Грамыкі да Макея. У нас яны былі і будуць, а ў тых, хто лаяў, — толькі ўсялякія бандэры і чэзлыя члены дывізій «нахтыгаль». У нас незалежныя дыпламаты, а не лакейскія «дыпляматы».

Узнікае слушнае пытанне: а навошта мы ўвогуле там, на гэтым фестывалі нявыхаванасці? Бо мы і там пераможцы! Адчуваем і паводзім сябе адпаведна. Толькі Беларусь і Расія. Тыя, хто выратаваў тую самую Еўропу ад знішчэння. Якая арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе існавала б, калі б чырвоны сцяг не быў узняты над рэйхстагам? Дарэчы, колькі б усялякія «швабы» ні намагаліся, але ж нармальных людзей там хапае. І яны павінны чуць ісціну аб нашай краіне. І няважна, хто будзе крыўляцца за спінай Савіных. Мы будзем даводзіць сваю пазіцыю, а яны — збіраць свае дызлайкі.

Тыя ж ЗША прылезлі пад самыя граніцы Расіі, а мы што — павінны забіцца ў кут за жалезным занавесам і чакаць чарговай узброенай атакі або ментальнай экспансіі, разбурэння палітычнага ладу або мяцежных тэхналогій? Не. Сёння сцэны арганізоўвае Варшава. А мы — наперад. Каб ізноў Вена і Дунай памяталі... Некалі ў Беларусі намагаліся правесці «васількову рэвалюцыю». Дарэчы, яе апазіцыйныя ўдзельнікі прызналіся, што пацярпелі поўнае фіяска. Але вось цікавая дэталь з таго часу. Згаданыя мяцежныя выбрыкі адбываліся каля сцен Палаца Рэспублікі, на Кастрычніцкай плошчы. А насупраць над праспектам вісеў красамоўны банер «Гастролі вялікага еўрапейскага цырка»... Відаць, цяпер гастролі тыя ўжо праходзяць на шматлікіх еўрапейскіх пляцоўках.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# ЗЯМЛЯ СПЕШКІ НЕ ЛЮБІЦЬ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Снежным вясновым ранкам накіроўваемся на мехдвор аддзялення «Бабінічы» вытворчага кааператыва «Альгоўскае». У ангары грукае жалеза, пішчыць «балгарка», стракоча зварка — працоўны дзень у разгары. Каля кожнага «жалезнага каня» — свой «урач» з гаечнымі ключамі. Механізатары найлепш ведаюць слабыя месцы сваіх машын, таму з канца лістапада, калі тэхніка становіцца на захоўванне пасля апошніх палявых работ, самі вядуць неабходны рамонт. А яго хапае: кожная адзінка патрабуе замены расходных запчастак, некаторыя агрэгаты — паўнавартаснага рамонту. У складаных пытаннях на дапамогу трактарыстам прыходзяць слесары і зваршчыкі. Талакой ужо падрыхтавалі машынны парк на 80 працэнтаў.



Трактарыст-машыніст Аляксандр ГАЛУШКА.

Каля сеялкі «Амазон Цырус — 6001» завіхаецца трактарыст-машыніст Дзмітрый Гапоненка. «Трэба памяняць утулкі, «пальцы», падрабіць сашнікі і паглядзець каткі. Амаль гатова: снег сыдзе — і ў поле», — пералічвае мужчына шэраг неабходных работ, якія чалавеку, далёкаму ад унутранай кухні мехдвара, зразумець складана. Побач ставіць новыя «зубы» травяной сеялцы «Кёхерлінг» замест пашкоджаных механізатар Аляксандр Галушка. Эх, прыгожыя яны, гэтыя «зубы» — чорныя, блiскучыя... Аб функцыі агрэгата расказвае загадчык рамонтнай майстэрні Дзмітрый Ізобаў: «Вясной на полі застаецца пласт з перагнілай леташняй травы, які замінае падсеву траваў. Гэтымі прыстасаваннямі трактар яго збірае, узрыхляе глебу, што значна паляпшае ўсходжасць».

«Капітальны рамонт закрануў і «Расу» — машыну для ўнясення мінеральных угнаенняў: варылі раму, рамантавалі каробку, зямянілі колы, — працягвае экскурсію па ангары Дзмітрый Аляксандравіч, — цяпер як новенькая, не падвядзе».

Па словах галоўнага інжынера ВК «Альгоўскае» Мікалая Захожага, на сённяшні дзень у гаспадарцы знаходзіцца на ўліку 48 трактароў, 8 з іх — энерганасычаныя. Два дыскатары, сем культыватараў, дзевяць плугоў — тэхнікі хапае для апрацоўкі ўсіх плошчаў кааператыва. Адной са складанасцяў, з якімі сутыкаюцца аграрыі падчас рамонту, з'яўляецца доўгая пастаўка неабходных запчастак, асабліва імпартных. Яны, дарэчы, патрабуюць і вялікіх фінансавых укладанняў: толькі для адной сеялкі «Амазон» спатрэбілася 70 тысяч рублёў.

На будучы сезон у «Альгоўскім» пад пшаніцу адведзена 500 гектараў, пад ячмень — 460, 200 гектараў пад рапс, 600 — пад кукурузу, 40 — пад гародніну. Як расказала **галоўны аграном вытворчага кааператыва Вольга ЯКАЎЛЕВА,** гаспадарка робіць стаўку ў роўнай ступені на збожжавыя культуры і гародніну, спецыялізуецца на продажы элітнага насення. Дарэчы, менавіта ў «Альгоўскага» можна набыць высакаякаснае насенне па прыемных цэнах, чым актыўна карыстаюцца не толькі шматлікія сельгаспрадпрыемствы краіны, але і насельніцтва.

Вольга Міхайлаўна — адна з тых спецыялістаў, хто аддаў рабоце ў гаспадарцы звыш 20 гадоў: пачынала ў 2000-м на сортавыпрабавальным участку, а будучая сяўба для яе будзе ўжо шостай на пасадзе агранома ў вытворчым кааператыве. Прафесійнага сакрэту па працы на зямлі ў яе няма: высокія ўраджаі можна атрымаць толькі пры захаванні тэхналогій на ўсіх этапах палявых работ — падкарміць, правесці хімпраполку, апрацаваць расліны ад шкоднікаў. І калі дваццаць гадоў таму «Альгоўскае» з-за цяжкіх умоў надвор'я падыходзіла да сяўбы апошнім — сёння земляробы пачынаюць работы як толькі сыдзе снег, прасушваючы глебу агрэгатамі. Дый зімой у агранома хапае клопату: з пачатку снежня пачынаюць заключаць дагаворы на пастаўку галандскага насення морквы і капусты, абнаўляюць элітнае насенне збожжавых культур, шукаюць неабходныя ўгнаенні. «За пяць гадоў работы не было ні адной лёгкай пасяўной, гэта заўсёды цяжкая і камандная праца. Калі, як той казаў, талакой не патупаем — потым не папоеш, — усміхаецца Вольга Міхайлаўна. — На маёй памяці няма і такога жніва, калі б мы не паспелі сабраць увесь ураджай».

А вось былы галоўны аграном вытворчага кааператыва Станіслаў Іосіфавіч Ястраб, які калісьці і натхніў маладога спецыяліста Якаўлеву зрабіць крок у бок сельскай гаспадаркі, такі год прыпамінае: у 2004-м з-за дажджлівага лета хлебаробы не змаглі ўбраць каля 40 гектараў ячменю, такая непагадзь тады панавала ва ўсім рэгіёне. Камбайны і трактары, збочваючы з дарогі на поле, літаральна гразлі ў раскіслай глебе і не мелі падыходу да нівы. Прыязджаў і Камітэт дзяржаўнага кантролю, але вынік быў адзін — сабраць «залатыя каласы», якія ў той год былі асабліва налітыя, немагчыма. «Я і дагэтуль помню, як зімой, калі праязджаў каля гэтага поля, сціскала сэрца. Але перад нябеснай канцылярыяй мы бездапаможныя», — успамінае Станіслаў Іосіфавіч. Пад яго кіраўніцтвам у 2008 годзе «Альгоўскае» прадэманстравала ўсёй краіне найвышэйшую ўраджайнасць збожжавых у Віцебскай вобласці — 60,8 цэнтнера з гектара. Гэта быў вялікі прарыў у параўнанні з пачаткам 1990-х гадоў, калі хлебаробы збіралі толькі 28,2 цэнтнера з гектара. Валавы збор збожжа павялічыўся ў 13 разоў, у засекі паклалі 10 тысяч тон хлебнага золата. Тады Прэзідэнт на рэспубліканскіх «Дажынках» уручыў кіраўніцтву вытворчага кааператыва «Знак Пашаны». У 2005 годзе паспрабавалі вырошчваць капусту, атрымалася. Пасля вывелі спосаб безрасаднага вырошчвання і не пралічыліся — па тэхналогіі, якой ужо больш за 15 гадоў, працуюць і сёння.

Да былой славы цяпер дацягнуцца цяжка — вялікая канкурэнцыя з буйнейшымі агрaхолдынгамі, аднак «Альгоўскае» сёння з'яўляецца вядучым прадпрыемствам у раёне па вырошчванні гародніны і збожжа, забяспечвае харчовую бяспеку ўстановам і арганізацыям раёна і цэлай краіне. Планы на будучы сезон у віцебскіх аграрыяў вялікія, галоўнае — каб надвор'е спрыяла.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,**
**фота аўтара.**

# ДЛЯ БУДУЧАГА ЎРАДЖАЮ

## На Брэстчыне зверылі пазіцыі гатоўнасці да сяўбы

**На выязным пасяджэнні Брэсцкага аблвыканкама на гэтым тыдні было разгледжана пытанне гатоўнасці да правядзення веснавых палявых работ. Перад пленарным пасяджэннем удзельнікі нарады наведалі шэраг гаспадарак Жабінкаўскага раёна, азнаёміліся са станам спраў на месцах.**

**Старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ШЧУПЛЯНКОЎ** агучыў найбліжэйшыя задачы. Так, сяўбу яравых культур гэтай вясной правядуць на плошчы больш за 400 тысяч гектараў.

Сёлета ў сельгасарганізацыях і фермерскіх гаспадарках вобласці плануецца атрымаць 1,55 мільёна тон збожжа, 1 мільён тон цукровых буракоў, 182 тысячы тон рапсу, 7,3 тоны льновалакна, 170 тысяч тон бульбы. Гэта дазволіць выканаць дзяржзаказ і забяспечыць сыравінай перапрацоўчыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Акрамя таго, належыць нарыхтаваць не менш за два мільёны тон травяных кармоў. З улікам усяго сфарміравана структура пасяўных плошчаў. Напрыклад, азімы палетак склаў 245 тысяч гектараў, а яравыя, адпаведна, трэба пасеяць на плошчы 406 тысяч. У тым ліку раннія яравыя будуць пасеяны на 103 тысячах гектараў.



У дакладзе адзначалася таксама, што гаспадаркі забяспечаныя насеннем збожжавых і зернебабовых культур, цукровых буракоў, лёну, шматгадовых траў. Асноўным фактарам атрымання высокіх ураджаеў, як вядома, з'яўляецца павышэнне ўрадлівасці глебы. Таму сельгаспрадпрыемствы працягваюць набываць сродкі аховы раслін, назапашваць мінеральныя ўгнаенні. Апошніх трэба на вясну 216 тысяч тон, цяпер ёсць прыкладна 60 працэнтаў ад патрэбы, але гэта значна больш, чым было на такі час летась. Арганікі на палеткі вывезена 9,6 мільёна тон з 10 мільёнаў запланаваных.

Ва ўсіх раёнах ідзе агляд трактароў, прычэпаў, іншай сельскагаспадарчай тэхнікі, якая будзе працаваць на пасяўной. Інжынерная служба абяцае закончыць агляд да 10 сакавіка.

У кантэксце размовы пра будучы ўраджай разглядалі пытанне аб аднаўленні меліяраваных земляў у рэгіёне. Адзначалася, што на дадзеную праграму выдзелена каля 150 мільёнаў рублёў. Неабходна ўвесці ў абарот 30 тысяч гектараў такіх земляў. «Работу трэба правесці якасна і ў сціслыя тэрміны, — заўважыў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.** — Таму што аддача ад меліяраваных земляў аграмадная. Гэта кормавытворчасць, збожжавая група, кармавая база для інтэнсіўнай жывёлагадоўлі і вытворчасці малака».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Грэцыі ў выніку сутыкнення цягнікоў загінулі 36 чалавек



Сама меней 36 чалавек загінулі і 66 атрымалі траўмы ў выніку сутыкнення пасажырскага і грузавога цягнікоў у Грэцыі, паведаміла «Бі-бі-сі». Катастрофа адбылася недалёка ад горада Ларыса. Пасажырскі цягнік выконваў рэйс IC62 з Афін у Салонікі, насустрач яму рухаўся грузавы састаў, які накіроўваўся з Салонік у Ларысу. Колы і іншыя дэталі абодвух саставаў разляцеліся на дзясяткі метраў, паведамляюць мясцовыя СМІ. «Сутыкненне было вельмі моцным», — сказаў журналістам губернатар рэгіёна Фесалія Канстанцінас Агарастас. Паводле яго слоў, першыя чатыры вагоны пасажырскага цягніка сышлі з рэек, пры гэтым галаўны і другі вагон былі амаль цалкам разбураныя. Як паведамляе тэлеканал Skai, пасажыры, якім не спатрэбілася медыцынская дапамога, былі эвакуіраваны на аўтобусах у Салонікі. Параненых адправілі ў найбліжэйшыя бальніцы. Некаторым з іх спатрэбіліся тэрміновыя аперацыі. Прэзідэнт Федэрацыі машыністаў Арганізацыі чыгунак Грэцыі (OSE) Костас Генідуніяс назваў верагоднай прычынай сутыкнення паломкі аўтаматычнай сістэмы папярэджання. Аб гэтым паведаміла Documentonews. «Сістэмы бяспекі даўно не працуюць. Святлафораў таксама няма, мы нічога не бачым», — сказаў Генідуніяс. У краіне аб'яўлена трохдзённая жалоба. Reuters адзначае, што трагедыя стала самай смяротнай чыгуначнай аварыяй у Грэцыі за апошнія дзесяцігоддзі.

***Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні народу Грэцыі ў сувязі са шматлікімі ахвярамі чыгуначнай аварыі. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.***

## Рост цэн на прадукты харчавання ў Вялікабрытаніі дасягнуў рэкорднага ўзроўню

Прадукты харчавання ў Вялікабрытаніі падаражэлі на 17,1 працэнта за чатыры тыдні. На дадзены момант гэта лічыцца рэкордным максімумам, паведаміла Reuters. Паводле інфармацыі брытанскай кампаніі па даследаванні рынку Kantar Group, хутчэй за ўсё цэны растуць на такія прадукты, як малако, яйкі і маргарын. У праведзеным арганізацыяй даследаванні адзначаецца, што брытанскія хатнія гаспадаркі сутыкнуцца з дадатковымі выдаткамі ў 811 фунтаў стэрлінгаў у сваіх рахунках за пакупкі. Як паведаміла Reuters, у лютым споўніўся год з таго часу, як месячны рост цэн на прадукты харчавання перавысіў чатыры працэнты. Падаражанне прадуктаў наносіць моцны ўдар па спажыўцах, якія і так ужо адчуваюць крызіс, звязаны з высокім коштам жыцця.

## Нідэрландскі сейсмолаг папярэдзіў аб моцным землетрасенні ў сакавіку

Вядомы навуковец з Нідэрландаў Франк Хугербітс, які прадказаў разбуральныя прыродныя катастрофы ў Турцыі і Сірыі, папярэдзіў, што ў пачатку сакавіка ў свеце адбудзецца наймацнейшае землетрасенне. У паведамленні навуковага інстытута Solar System Geometry Survey (SSGEOS), дзе працуе вучоны, адзначаецца, што збліжэнне планет 2 і 5 сакавіка можа прывесці да надзвычайнай вялікай сейсмічнай актыўнасці, адзначыла «Расійская газета». Чарада землетрасенняў можа адбыцца з 3 да 7 сакавіка 2023 года. Магнітуда падземных штуршкоў можа скласці 8,5 бала і вышэй. Землетрасенне закране Расію (Курыльскія астравы), Японію, краіны Паўднёвай Еўропы, Інданезію, Пакістан, а таксама частку Паўночнай Амерыкі. «Я не перабольшваю, не спрабую пасеяць страх, проста папярэджваю», — заўважыў вучоны.

# ПАЧАЦЬ З СЯБЕ



*У мяне дома на паліцы побач з кнігамі стаіць скрынка. Туды я складваю прыемныя дробязі, што куплю з думкай: «Гэта падару пры сустрэчы Тані, а гэта адназначна спадабаецца Алесю...» Днямі, пакуль шукала патрэбны прэзент, вока зачапілася за новенькі гліняны кубак з трэшчынай. Муж набываў на кірмашы кававы сервіз ручной работы, дык вось у якасці бонуса майстар аддаў яму той бракаваны кубачак. Ужо чатыры гады ён ляжаў у скрынцы незапатрабаваны. Я доўга круціла яго ў руках, разглядала, гладзіла. І мне ён падаўся такім прыгожым. Нават з трэшчынай. Больш за тое, падумалася, што без той трэшчынкі гэта быў бы зусім звычайны кубак. Убачыўшы прыгажосць у недасканалым, паказала сваю знаходку мужу. Маўляў, чаму ён ляжыць без справы? Давай што-небудзь прыдумаем. І адна за адной пасыпаліся ідэі: можна зрабіць з яго званочак на дзверы ці выкарыстаць як падсвечнік...*

*У той дзень я падумала, што мы, людзі, як тыя кубачкі: у кожным з нас ёсць свая трэшчынка, і не адна. І так важна, каб побач быў хтосьці, хто любіў і прымаў бы цябе такім, які ты ёсць. А потым прыйшла яшчэ адна думка: што не варта чакаць прыняцця ад іншага. Самы галоўны чалавек, які павінен прымаць цябе, — гэта ты сам. Як піша Глорыя Мур, «палюбі сябе сама, а астатнія падцягнуцца».*

*Нядаўна знаёмая напісала пост пра свайго сына-школьніка. «Ваня ўдзельнічаў у конкурсе па беларускай мове. Ужо дома мы разбіралі заданні і знайшлі некалькі памылак. Калі дайшлі да трэцяй памылкі — сын пачаў плакаць, а потым наогул парваў усе паперкі. Спытала, чаму ты так расстройваешся, я ж на цябе не сваруся? Сказаў, што баіцца асуджэння аднакласнікаў, якія хіхікаюць, калі ён атрымлівае адзнаку ніжэй за «9». А другую прычыну толкам не змог патлумачыць, проста назваў яе памылкафобіяй. І вось як з гэтым змагацца? Быццам бы пастаянна тлумачу, што можна быць неідэальным, рабіць памылкі, што любіць з-за гэтага я яго не перастану. Вельмі не хачу, каб ён баяўся памылак (хоць сама якраз такая ж), таму што гэта тармозіць рух. Што параіце? Як навучыць дзіця не баяцца памылак?»*

*«Думаю, варта пачаць з сябе, — напісала я ёй. — Самой навучыцца ставіцца да сваіх памылак спакойна, з гумарам. Бо прыклад мамы заразлівы». І параіла пагуляць з сынам у гульню «Хто больш памылак зробіць спецыяльна». Напрыклад, можна адно аднаму пісаць запіскі з памылкамі. А потым разам пасмяяцца.*

*Чаму трэба пачынаць з сябе? Па-першае, таму што мы не зможам навучыць іншага чалавека быць лепей, чым ёсць самі. Па-другое, тое, што мы хочам змяніць у іншых, перш за ўсё трэба змяніць у нас саміх. «Добры спосаб выявіць свае недахопы — знайсці тое, што раздражнае цябе ў іншых», — пісаў Энтані дэ Мело. Бо мы лепш за ўсё бачым у іншых менавіта свае недасканаласці. Праверана на практыцы: калі мы становімся лепшымі, нас усё менш і менш раздражняюць учынкі іншых. І нейкім дзіўным чынам мяняюцца і павадзіны апошніх.*

*Адзін малады чалавек марыў змяніць свет. З гэтай мэтай выправіўся ў вандроўку. Ішлі гады, але ён заўважыў, што, як бы ён ні стараўся, свет не мяняўся. Тады хлопец вырашыў стрымаць свой запал і змяніць парадак толькі ў сваёй краіне. Але і з гэтага нічога не атрымалася. Тады ён вырашыў вярнуцца дадому і паспрабаваць змяніць толькі сваю сям'ю. Але блізкія, на жаль, і не падумалі лічыцца з яго павучаннямі. І толькі на старасці гадоў той чалавек нечакана зразумеў: «Адзіны, каго я магу змяніць у гэтым жыцці, — гэта я сам. Пачынаць трэба было з сябе. Калі б я спачатку змяніўся сам, тады ўласным прыкладам змяніў бы сваю сям'ю. А потым, кіруючыся іх адабрэннем, я, магчыма, змог бы палепшыць становішча спраў у маёй краіне, і, хто ведае, можа быць, нават змяніў бы свет. Таму, калі вы таксама хочаце змяніць свет, краіну, сына, не станавіцеся на чужыя граблі, а... пачніце з чалавека ў люстэрку.*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**


Сямейная газета

Выпуск № 4 (207)


Тыя, хто побач

**Дзіяна ТАЛІНА:**

# «НАША ШЧАСЦЕ СКЛАДАЕЦЦА З ДРОБЯЗЯЎ»

**Кажуць, што момант знаёмства — гэта момант ісціны. Таму, калі мы ўпершыню ўбачылі нашу госцю, не маглі не заўважыць яе прыроджаную сціпласць, што для творчай асобы, згадзіцеся, рэдкасць. Аднак на сцэне ад сціпласці не застаецца і следу — яна яркая, таленавітая, харызматычная! Са сваёй сцэнічнай дзейнасцю наша гераіня ўдала сумяшчае ролі маці і любячай жонкі. Аб творчасці і сям'і мы пагаварылі з лаўрэатам і дыпламантам міжнародных фестываляў і конкурсаў, беларускай эстраднай спявачкай Дзіянай ТАЛІНАЙ.**


*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*




# Дабрыня, якая выратоўвае

## Беларускаму дзіцячаму фонду — 35!

**Днямі Беларускі дзіцячы фонд адзначыў сваё 35-годдзе. За гэты час рэалізаваны дзясяткі тысяч дабрачынных праграм, якія дапамаглі сотням тысяч дзяцей. Многія вядомыя сёння праекты пачыналіся менавіта з ініцыятыў згаданай грамадскай арганізацыі — ад традыцыі адзначаць Міжнародны дзень абароны дзяцей да такіх маштабных акцый, як «Нашы дзеці». Выхаванне малых, што засталіся без бацькоў, у дамах сямейнага тыпу і стварэнне першых такіх дамоў у нашай краіне — таксама добрае пачынанне Беларускага дзіцячага фонду.**

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Беларускі дзіцячы фонд» з'явілася 27 лютага 1988 года. Сёння гэта адна з найстарэйшых грамадскіх арганізацый краіны. Яе місія застаецца нязменнай — абарона правоў і інтарэсаў дзяцей, аказанне ім маральнай і матэрыяльнай дапамогі. У першую чаргу гэта падтрымка дзяцей-сірот, малых са шматдзетных і няпоўных сем'яў, дзяцей-інвалідаў і цяжкахворых, а таксама тых, хто сёння мае асаблівую патрэбу ў дапамозе.

У фондзе шэсць абласных арганізацый і 83 раённыя аддзяленні, яны аб'ядноўваюць больш за 20 тысяч чалавек. Многія яго пачынанні і праграмы падтрымліваюцца дзяржавай. Напрыклад, у далёкім ужо 1988 годзе па ініцыятыве фонду ўпершыню адзначаўся Міжнародны дзень абароны дзяцей. Згодна з указам Прэзідэнта, традыцыя працягваецца ў нашай краіне да гэтага часу.

Сёння ў нас паспяхова дзейнічае 289 дамоў сямейнага тыпу, работу якіх каардынуе асобная дзяржаўная праграма. Аднак мала хто ведае, што ініцыятыва іх стварэння належыць Беларускаму дзіцячаму фонду: у 1989-м быў арганізаваны першы такі дом.

У 1990 годзе першае беларускае дзіця было накіравана на лячэнне за мяжу — таксама па ініцыятыве фонду, пасля там пралячылі яшчэ 440 малых. У 1990—1991 гадах у рамках акцыі «Салідарнасць з дзецьмі Чарнобыля» больш за дзве тысячы дзяцей было накіравана на аздараўленне. Праз маленькіх беларусаў свет даведаўся пра чарнобыльскую трагедыю і пра Беларусь. І сёння дабрачынная арганізацыя працягвае падтрымліваць дадзеную праграму лячэння, аздараўлення і рэабілітацыі.

Менавіта Беларускі дзіцячы фонд выступіў з ініцыятывай прыняцця закона «Аб правах дзіцяці», заснаваў прэмію імя Зінаіды Тусналобавай-Марчанкі, якую атрымала больш за 90 сем'яў. У 1991-м распачаўся адзін з самых маштабных сёння дабрачынных праектаў, які з'яўляецца сімвалам дабрыні і спагады беларусаў. Тады ён меў назву «Сагрэем дзіцячыя сэрцы», а сёння ўсім вядомы як «Нашы дзеці». Апошнія два гады праект змяніў фармат: фонд аб'яўляе збор сродкаў, якія пасля накіроўваюцца тым установам адукацыі і аховы здароўя, што маюць у іх патрэбу.

У 1992 годзе адбыўся арганізаваны фондам тэлемарафон «Выратуем дзяцей» — самы буйны на той момант, ён працягваўся 14 гадзін. Цяпер штогод такі марафон у рамках акцыі «Нашы дзеці» праводзяць абласныя падраздзяленні арганізацыі.

У 1993 годзе Беларускі дзіцячы фонд ініцыяраваў правядзенне першага пасяджэння дзіцячага парламента. А сёння маладзёжныя і падлеткавыя парламенты працуюць у 30 беларускіх гарадах у рамках ініцыятывы ЮНІСЕФ «Гарады, дружалюбныя дзецям і падлеткам», да якой Беларусь далучылася ў 2008 годзе.


*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

# Дабрыня, якая выратоўвае

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

Шмат рэалізаваных праграм датычыцца лячэння дзяцей. Адна з іх — «Дзіцячае сэрца», якая ажыццяўляецца з падтрымкай Міністэрства аховы здароўя.

— Каля тысячы дзяцей з цяжкімі захворваннямі сэрца выратавана, каля 400 накіравана на лячэнне ў замежныя клінікі. Больш за 500 малых прааперыравалі ў Беларусі, больш за дзве тысячы дзяцей з парокамі сэрца атрымалі кансультацыі з удзелам замежных спецыялістаў і клінік, — расказвае **старшыня праўлення Беларускага дзіцячага фонду Людміла КАНДРАШОВА.** — У рамках праграмы пастаянна вядзецца перадача медыцынскага абсталявання ўстановам аховы здароўя краіны. З 2018 да 2022 года былі перададзены 63 адзінкі сучаснага медыцынскага абсталявання на суму больш за 2,5 мільёна рублёў. У цяперашні момант Беларускі дзіцячы фонд дапамагае РНПЦ «Кардыялогія».

З 1991 года адкрыта першая рэабілітацыйна-аздараўленчая змена «Вясёлка надзеі» для анкалагічна хворых дзяцей, а пасля і «Вясёлыя сардэчкі» — для дзяцей, якія перанеслі сур'ёзныя аперацыі на сэрцы або маюць захворванні сардэчна-сасудзістай сістэмы. У іх рамках непаўналетнія праходзяць рэабілітацыю ў дзіцячых цэнтрах «Надзея» і «Зубраня».

Даўно шырока вядомыя такія праграмы, як «Юны талент», «Я бачу», «Стрыт-варкаўт». У рамках апошняй, напрыклад, было ўстаноўлена 18 першых варкаўт-пляцовак, якія і цяпер функцыянуюць. Ёсць і даволі нечаканыя праекты, адзін з іх — праграма па навучанні жанчын арганічнаму земляробству, якая рэалізоўваецца ў Віцебскай вобласці ў рамках узаемадзеяння з рэспубліканскім цэнтрам экалогіі.

Беларускі дзіцячы фонд узнагароджаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне», Падзякай Прэзідэнта, Ганаровай граматай Савета Міністраў, Ганаровай граматай Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, ганаровымі граматамі многіх міністэрстваў і ведамстваў.

— У нас за плячыма 35 гадоў дабра і міласэрнасці. Мы ўдзячныя ўсім, хто нас падтрымлівае, і ідзём наперад. У нас зроблена шмат, але яшчэ мноства задач наперадзе, якія мы будзем ажыццяўляць, — рэзюмавала Людміла Кандрашова.

**Алена КРАВЕЦ.**

# З УВАГАЙ ДА ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**«Школьная бібліятэка класікі» — так называецца адзін з новых кніжных праектаў Выдавецкага дома «Звязда», тэматычная прастора якога фарміруецца ў супольным абмеркаванні выдавецтва і Саюза пісьменнікаў Беларусі.**

Серыя складаецца з грунтоўных зборнікаў, у якія ў першую чаргу ўключаюцца творы, што вывучаюцца ў межах школьнай праграмы агульнаадукацыйнай школы, а таксама рэкамендуюцца для знаёмства вучням у фармаце пазакласнага чытання.

Літаральна днямі ў друкарню здадзены чарговы том «Школьнай бібліятэкі класікі» — зборнік, дзе знайшлося месца паэтычным і празаічным здабыткам як класікаў, так і сучаснікаў. Кнігу-квэст Кацярыны ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВОЙ «Ключ ад Вялікай Каштоўнасці» дапаўняе аповесць Янкі МАЎРА «У краіне райскай птушкі». Пад адной вокладкай — і апавяданні Васіля ВІТКІ «Трывога ў Ельнічах», Івана ПТАШНІКАВА «Арчыбал», апавяданні народнага песняра Беларусі Якуба КОЛАСА са славутых «Казак жыцця». А яшчэ — надзвычай захапляльная казка Генадзя АЎЛАСЕНКІ «Чаму Дукоры такую назву маюць», якая ўпершыню ўбачыла свет у аўтарскім зборніку «Таямніцы назваў», і паэма Святланы БЫКАВАЙ «Легенда Заслаўя».

— Прыярытэты ў кнігавыдавецтве сёння, несумненна, — за дзіцячай літаратурай, — разважае загадчыца кніжнай групы Выдавецкага дома «Звязда» Наталля ШЧАРБАКОВА. — Захавае юны чытач цікаўнасць да прыгожага пісьменства, да друкаванай кнігі — значыць, з яго вырасце адукаваны, дзеяздольны, удумлівы грамадзянін нашай краіны, які будзе сапраўдным патрыётам роднай Беларусі. Дарэчы, у планах нашага выдавецтва — выданне новых кніг Паўла ГУШЫНЦА, Галіны ПШОНІК, Генадзя АЎЛАСЕНКІ, Ягора КОНЕВА, Таццяны ДЗЕМІДОВІЧ, Алены СТЭЛЬМАХ, Аляксея ШАЎЦОВА, Міхаіла ДЗЕРАВЯНКІ... Гатовая назваць вельмі шмат імёнаў тых празаікаў, паэтаў, якія згрупаваліся вакол нашага выдавецтва. Дарэчы, яны — частыя госці ў школьных і гарадскіх, раённых бібліятэках, а таксама — у бібліятэках аграгарадкоў і нават у дзіцячых садках.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Насуперак стэрэатыпам

# Слёзы — гэта нармальна ў любым узросце

## І для хлопчыкаў таксама

**У дзяцінстве Сашу ўнушалі, што «хлопчыкі не плачуць». І цяпер ён тое ж самае, як пад капірку, кажа сваім сынам. Ледзь толькі Мірон ці Мацвей заплачуць, адразу ж чую: «Ану, супакойся! Ты што, не мужык?!» Калі сусед тое ж самае неяк заявіў майму сыну, у мяне ўнутры з'явіўся пратэст. Я тады сказала Сымону, што дзядзька памыляецца — у тым, што хлопчык плача, няма нічога страшнага.**

**Як правільна рэагаваць на дзіцячыя слёзы? Што нельга рабіць падчас істэрыкі і што трэба? На гэтыя пытанні я знайшла адказы дзякуючы псіхолагу Карыне Рыхтэрэ. Год таму прымяніла яе парады на практыцы, і цяпер у майго 4-гадовага сына практычна няма істэрык. Не, ён па-ранейшаму плача, але гэта ўжо слёзы адаптацыі.**



### МАМА ТАНЦУЕ!..

Прырода не прыдумала нічога лішняга, і слёзы — яе геніяльнае вынаходніцтва. Дзеці плачуць. І гэта цалкам нармальна. Проста ў дарослых не заўсёды бывае адэкватная рэакцыя на дзіцячыя слёзы. Мы лічым, што гэта нешта лішняе. Пастаянна кідаемся фразамі: «Не плач. Плакаць сорамна. Плакаць непрыгожа». Але псіхолагі сцвярджаюць, што забараняць дзіцяці плакаць, спрабаваць яго «выключыць» любой цаной у корані няправільна. Бо слёзы — ключавы механізм адаптацыі і развіцця асобы.

Кожнай маме трэба адрозніваць у дзіцяці два віды слёз. Слёзы пратэсту (непасрэдна сама істэрыка). Гэта крыкі і віск на высокіх нотах: «Ааа, не хачу, не буду!» Дзіця змагаецца, спрабуе змяніць сітуацыю, хоча, каб вы перадумалі, прынялі іншае рашэнне. З крыкамі «дай мне яшчэ адну цукерку!», «я хачу яшчэ адзін мульцік!» падае на падлогу, тупае нагамі, псіхуе. Цела пры гэтым напружана. Другі від слёз — слёзы адаптацыі. Калі дзіця выплаквае сваё гора, расчараванне, але пры гэтым разумее, што змяніць сітуацыю не можа. Гэта па-ранейшаму гучна, не заўсёды прыгожа, але ўжо на нізкіх нотах. «Ну, мама, ну чаму ты не даеш мне гэтыя цукеркі?» І цела пры гэтым расслабляецца. Дзіця разумее: ну не дасць мама 15-ю цукерку, не ўключыць мульцік. І паступова прымае сітуацыю, пры гэтым мяняецца стаўленне да яе. «Нічога не паробіш, такое жыццё. Хочаш — не хочаш, але трэба сыходзіць з пляцоўкі, класціся спаць, рабіць хатняе заданне». Калі дзіця выходзіць на адаптацыйныя слёзы, мудрая мама танцуе ў душы ад радасці.

Адаптацыйны механізм — ключавы для навучання, развіцця новых навыкаў, для поспеху ў жыцці. Так дзіця разумее, што не заўсёды ўсё будзе так, як хоча яно. Не пазбегнуць непрыемнасцяў, цяжкасцяў, праблем. Іх трэба ўмець вырашаць. Але перш трэба перавыразіць негатыўныя эмоцыі, вывесці іх з арганізма. І слёзы — самы просты, экалагічны спосаб гэта зрабіць. У якасці прыкладу можна прывесці сітуацыю з адзнакамі. Калі дзіця ў 9 гадоў плача з-за «двойкі» — гэта нармальна. Тут пытанне ў тым, плача ці псіхуе? Калі сын прыходзіць дадому і кажа: «Мама, зноў гэта двойка. Я так стараўся. Мне здаецца, гэта несправядліва», — выплаквае сваё гора і ідзе рабіць урокі з новымі сіламі, значыць, усё ідзе нармальна. Калі ж ён толькі псіхуе, рве сшыткі — тут навідавоку «правісанне» адаптацыйных слёз.

Калі раз за разам выводзіць дзіця са слёз пратэсту ў слёзы адаптацыі — праз нейкі час вы забудзецеся пра істэрыкі. Калі ж бацькі сваімі словамі, дзеяннямі блакіруюць адаптацыйны механізм, пакідаюць дзіця толькі ў істэрыцы — яму прыйдзецца нялёгка і ў школе, і ў далейшым жыцці.

### ШТО НЕЛЬГА РАБІЦЬ ПАДЧАС ІСТЭРЫКІ

**1) Ніколі не карайце дзіця за істэрыку.** Адна мама напісала: істэрыка заканчваецца, калі ў мяне ў руках аказваецца ручнік. Гэта неадэкватная рэакцыя на істэрыку. Дзіця спужаецца, выключыцца, запіхне сваю эмоцыю ўнутр, у сябе. Што далей? Будзе яшчэ больш істэрык, агрэсій, цяжкасці з вучобай, псіхасаматычныя захворванні, гаджэтавая залежнасць... Караць за эмоцыю — гэта апошняе, што мы можам зрабіць. Падумайце, за што вы яго караеце? За тое, што ён адчувае боль, страх, расчараванне, злосць... За тое, што яму нешта не падабаецца. А хіба яму павінна падабацца ўсё, што вы кажаце?

**2) Не пазбаўляйце дзіця падтрымкі, не ігнаруйце яго.** Нельга казаць падчас істэрыкі: «Супакоішся — тады прыйдзеш. Ідзі ў свой пакой. Я з табой не размаўляю». Калі дзіця валяецца на падлозе ў краме, нельга рабіць выгляд, што вы сыходзіце, што гэта не ваша дзіця.

**3) Ні ў якім разе не дазваляйце тое, што забаранілі.** Вельмі небяспечная стратэгія падчас істэрыкі: «На табе цукерку, толькі замаўчы; на табе мульцік, толькі не вынасі мне мозг». Так вы цалкам блакіруеце адаптацыйны працэс. Дзіця разумее, што маміна «не» можа ператварыцца ў «так», проста трэба даўжэй пакрычаць. Калі інструмент працуе — чаму б ім не карыстацца? Бывае сітуацыя, што дзіця спрабуе дамовіцца. «Ну мам, калі ласка, можна яшчэ адзін мульцік!» І ў прынцыпе вы можаце дазволіць яму паглядзець мульцік яшчэ 10 хвілін, нічога страшнага ў гэтым няма. Мы можам ісці дзіцяці насустрач, але не тады, калі яно крычыць, псіхуе. Калі дзіця зразумее, што падчас істэрыкі мама ні пры якіх умовах не зменіць сваё «не» на «так», яно пераходзіць на адаптацыйныя слёзы, бо пратэставаць бессэнсоўна. З часам істэрык, капрызаў, успышак агрэсіі становіцца ўсё менш і менш і застаюцца толькі слёзы адаптацыі. Дзіця проста адразу выплаквае сваё гора: «Мам, ну чаму мыццё такое складанае, чаму гэтыя ўрокі трэба рабіць?!» Супакойваецца і працягвае рабіць урокі. Калі ў дзіцяці ў 5-6 гадоў шмат істэрык, псіхаў, крыкаў, агрэсіі — гэта сведчыць пра адно: не былі ўстаноўлены адаптацыйныя механізм.

### ШТО ТРЭБА РАБІЦЬ ПАДЧАС ІСТЭРЫКІ

**1) Прагаворвайце сітуацыю.** «Ты моцна расстроіўся, бо хацеў трэці мульцік, а мама табе не дазваляе, ты хацеў яшчэ адну пячэньку, а яны скончыліся».

**2) Называйце эмоцыю.** «Я бачу, як табе цяжка, балюча, як табе непрыемна, бачу, што ты злуешся». Тым самым тлумачым, што з ім насамрэч адбываецца.

**3) Прапаноўвайце падтрымку.** «Я бачу, што ты не хочаш сыходзіць з дзіцячай пляцоўкі. Ідзі сюды, я цябе абдыму. Пашкадую, пасажу цябе на ручкі, пагладжу цябе па галаве, патрымаю цябе за руку. Я не ўключу табе мульцік, бо па-ранейшаму трэба рабіць урокі, але я табе паспачуваю ў тым, што табе так цяжка даецца, я пабуду з табой, пакуль ты пражываеш гэту эмоцыю, спрабуеш з ёй справіцца, дапамагу табе яе перажыць. Я — твой дарослы, і ты можаш на мяне абаперціся».

Вучыць дзіця слязам адаптацыі лепш за ўсё з 1,5—3 гадоў. Калі спазніліся, гэта не катастрофа. Да сямі гадоў дзіця — як пластылін, усё вельмі лёгка выправіць. Пасля сямі — таксама рэальна, проста складаней. Чым старэйшае дзіця, тым спатрэбіцца больш часу. Нават мужу, які вельмі шмат злуецца і псіхуе, можна вярнуць «адаптацыйныя слёзы». Проста трэба навучыцца аказваць яму правільную эмацыянальную падтрымку. Не «пілаваць», не даваць свае парады. Сказаць: «Хочаш, я табе звару гарбату, наляплю пяльмешак, зраблю масаж?.. Я бачу, як табе складана. Чым я магу табе дапамагчы?» Наогул, слёзы павінны быць у адкрытым доступе ў кожнага. Мы жывыя людзі, штосьці здарылася, расстроіліся — выплакаць гэту эмоцыю абсалютна нармальна ў любым узросце. Нават калі вы ў 35, 40, 50 гадоў не ўмееце экалагічна пражываць злосць, страх, гнеў, сум, ніколі не позна навучыцца, вярнуць сабе доступ да слёз адаптацыі. Проста пачніце прагаворваць тое, што адчуваеце. Бо самае экалагічнае выяўленне эмоцый — гэта іх агучванне.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

# «НАША ШЧАСЦЕ СКЛАДАЕЦЦА З ДРОБЯЗЯЎ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Дзіяна, усё пачынаецца з сям'і... Раскажыце, калі ласка, пра сябе. Ваша схільнасць да музыкі, мабыць, перадалася ад родных?***

— Я карэнная брастаўчанка. І сапраўды, у мяне музычная сям'я. Я ўдзячная матулі, што яна прывіла мне любоў да музыкі. Мая любімая мама Таццяна Анатолеўна была ўдзельніцай брэсцкіх калектываў «Сузор'е», «Берасцейка» і іншых. У свой час яны аб'ездзілі ўвесь Савецкі Саюз... Таму дома гучалі толькі народныя спевы. Але я абрала «папсовы» кірунак, бо сёння ён вельмі папулярны і любімы многімі, асабліва поп-шансон.



**«Я ўдзячна матулі, якая прывіла любоў да музыкі».**

У сем гадоў я паступіла ў брэсцкую музычную гімназію № 4, была салісткай узорнага хору «Cantus» (кіраўнік А. А. Шэлест). Вельмі любіла выступленні, конкурсы... У піянерскім летніку «Салют» у 12 гадоў на адным мерапрыемстве я праспявала папулярную песню тых часоў «Вецер з мора дуў» спявачкі Наталі і заняла першае месца. Вельмі хвалявалася перад сваім першым выхадам на сцэну. Ды і цяпер, вядома ж, хвалююся, бо які артыст не хвалюецца?

Былі пастаянныя заняткі па вакале. Маім настаўнікам, сябрам — і тых школьных гадоў, і цяпер — з'яўляецца выдатны педагог Ларыса Іванаўна Бадратдзінава.

***— Дзіяна, што найбольш запомнілася з дзяцінства?***

— Мая мама, педагог, заўсёды ведала, ад самага майго нараджэння, як і чым мяне зацікавіць. Я займалася ва ўсіх магчымых гуртках, студыях і індывідуальна — з найлепшымі педагогамі па вакале. Напэўна, для дзіцяці самае галоўнае, каб яно развівалася, займалася па сваіх інтарэсах. Маё дзяцінства праходзіла, як і ва ўсіх дзяцей у тыя гады. У школьны перыяд гэта падрыхтоўка да ўрокаў, шматлікія заняткі ў гуртках, студыях... А летам — актыўныя гульні і, вядома ж, адпачынак у летніках. На святы мы заўсёды збіраліся вялікай сям'ёй — Новы год, Каляды, Вялікдзень, 8 Сакавіка...

***— Раскажыце пра свой творчы графік. З чаго пачынаецца дзень?***

— Мой дзень пачынаецца з кубка духмянай кавы, лёгкага сняданку і прагляду спіса запланаваных спраў. Творчы графік вельмі шчыльны: шматлікія рэпетыцыі, запісы, падрыхтоўка да канцэртаў з маім балетам, аранжыроўкі, здымкі кліпаў. Люблю браць удзел у конкурсах і фестывалях. Адзін з іх назаўсёды застанецца ў маёй памяці. Гэта Міжнародны фэстываль-конкурс «Марская жамчужына» ў Адэсе, які праходзіў у 2019 годзе. Я прадстаўляла



нашу краіну і прывезла заслужаную ўзнагароду — «Залатую жамчужыну». Гэта было цікава і вельмі хвалюююча для мяне! У Брэсце не так даўно прайшлі тры мае сольныя канцэрты «Па тонкіх лініях», «Любоў напалову», «Мая гісторыя». Сваёй творчасцю падзялілася з жыхарамі гарадоў Высокае, Баранавічы, Маларыта, Пінск і іншых. У планах — радаваць маіх любімых гледачоў новымі вобразамі, песнямі, канцэртамі і выступленнямі.

***— Напэўна, пры такім графіку цяжка сумяшчаць працу і сям'ю?***

— Гэтае пытанне хвалюе ўсіх, хто хоць крыху ведае мяне. Так, у мяне атрымліваецца ўсё сумяшчаць дзякуючы разуменню і падтрымцы блізкіх. Немагчыма быць сёння спявачкай, заўтра мамай, паслязаўтра жонкай — неабходна быць усімі адначасова, тут і цяпер. Мая сям'я мяне заўсёды ва ўсім падтрымлівае, гэта мой надзейны тыл. Яны суправаджаюць мяне на ўсіх канцэртах, на ўсіх выступленнях, заўсёды хвалююцца за мяне. Таму толькі дзякуючы падтрымцы сям'і мне ўдаецца ўсё сумяшчаць.

***— Я ведаю, што ваш муж Віталь таксама творчая асоба. Як вы пазнаёміліся?***

— Свайго мужа я ўбачыла на сцэне Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы (раней «Брэсцкі тэатр драмы і музыкі») на адной з самых цікавых музычных пастановак «Брэменскія музыканты» (рэжысёр Д. Нуяндзін).

Пасля мы з Віталем сустрэліся на адным мерапрыемстве, дзе ён быў у якасці госця, а мяне запрасілі выканаць некалькі песень. Пасля заканчэння майго выступлення ён прызначыў першае спатканне... І ўсё закруцілася. З таго незабыўнага моманту, які змяніў нашы лёсы, прайшло 15 гадоў.

***— Як святкавалі вяселле?***

— Прапанова рукі і сэрца была чароўная! Таму і вяселле было такое ж: з размахам *(усміхаецца)*. Заказалі рэстаран, лімузін, артыстаў, запрасілі гасцей. Ну, і ўсё такое ў вясельным духу.

***— Скажыце, пры такім публічным жыцці, напэўна, ёсць месца для рэўнасці? І як вам удаецца, нягледзячы ні на што, жыць у згодзе шмат гадоў? Ёсць нейкі сакрэт?***

— Ёсць давер, каханне і паразуменне. А сакрэтаў няма: можа, у гэтым і ёсць уся разгадка *(смяецца)*.

***— Дзіяна, чым сёння здзіўляе муж? Які найбольш запамінальны падарунак ён зрабіў і якія сюрпрызы робіце яму вы?***

— Мой муж заўсёды ведае, што і як зрабіць, каб гэта было нечакана і прыемна. Аднойчы, яшчэ ў студэнцкія гады, прыехаў на лімузіне ў дваццаціградусны мароз да прыступак універсітэта з вялізным букетам белых руж, а з лімузіна ў гэты момант — песня «Букет из белых роз...» А ў нас якраз скончыліся заняткі, і студэнты пачалі выходзіць з універсітэта. Так усе і засталіся стаяць на ганку, глядзелі, што адбываецца, пакуль мы не з'ехалі. Гэта было запамінальна. Я ў сваю чаргу стараюся рабіць прыемнае для мужа і натхняю на новыя сюрпрызы.

***— У вас расце сын, чым ён захапляецца?***

— Арсеню 9 гадоў. Ён усе мае песні добра ведае, ганарыцца мной, ён самы мой актыўны прыхільнік *(смяецца)*. Таксама займаецца музыкай, іграе на акардэоне. Ці будзе артыстам, не ведаю, але мы з мужам падтрымаем яго выбар.

***— Хто ў вас галоўны кухар у сям'і? Якімі стравамі здзіўляеце адно аднаго?***

— Галоўны кухар у нас мой муж. Як вядома, мужчыны гатуюць лепш за жанчын. Звычайна я складаю меню, а мой муж купляе інгрэдыенты і гатуе. Асабліва ён любіць гатаваць стэйк-грыль са смажанымі артышокамі і бульбай.

***— А традыцыі у вашай сям'і ёсць?***

— Кожная сям'я мае свае звычаі і традыцыі. Яны прыносяць у дом гармонію адносін і пачуццё надзейнасці. У нас у сям'і ёсць традыцыя падарожнічаць і разам адпачываць.

***— Дзіяна, як вы з мужам знаходзіце час для бытавых спраў, бо ў сямейным жыцці без гэтага нікуды, а прафесія артыста патрабуе вельмі шмат часу?***

— Проста імкнёмся правільна размяркоўваць свой дзень.

***— Што, на ваш погляд, самае галоўнае для шчаслівага сямейнага жыцця?***

— Паразуменне, павага адно да аднаго і, вядома ж, каханне...

***— Дзіяна, дайце, калі ласка, свае парады для маладых пар, якія збіраюцца стварыць сям'ю.***

— Сямейнае шчасце складаецца з дробязяў. Не забывайце казаць «дзякуй» за кожную дробязь, якую каханы чалавек робіць для вас. Дарыце каханне і цеплыню проста так і ніколі не пераставайце слухаць і чуць адно аднаго. Кожны павінен ставіць інтарэсы каханага чалавека на першае месца. Муж клапоціцца пра жаданні жонкі больш, чым пра ўласныя, і наадварот — гэта правіла сапраўды працуе і дапаможа пазбегнуць шмат якіх сямейных праблем.

***— Адкуль чэрпаеце натхненне і сілы? Як любіце адпачываць і аднаўляцца пасля канцэртаў, каб зноў ззяць як зорка?***

— Чэрпаю сілы ў сваёй сям'і. Вельмі любім адпачываць у розных кутках маёй любай Беларусі, а менавіта ў Белавежскай пушчы. Энергія лесу, зачараваныя краявіды, магчымасць паназіраць за дзікімі жывёламі — усё гэта вельмі перазараджае і перазагружае.

***— Дзіяна, вы вельмі яркая, таленавітая спявачка, прыгожая жанчына. Раскрыйце сакрэт вашай прыгажосці?***

— Я вельмі сціплы чалавек і ніколі не акцэнтую на сабе ўвагу, але калі мяне пазнаюць і падыходзяць, просяць аўтограф, мне вельмі прыемна. Наконт маёй яркай знешнасці — магіі ніякай няма. Галоўны сакрэт прыгажосці — здаровы сон.

***— Слухаючы вашы песні, адчуваеш, што вы ўкладаеце ў іх частачку і свайго ўласнага жыцця.***

— Усе песні розныя. І, выконваючы кожную з іх, я быццам пражываю маленькую гісторыю, маленькае жыццё. Тое, што я адчуваю падчас выканання, адчувае і мой любімы глядач. Для мяне гэтыя імгненні вельмі дарагія! Я заўсёды адкрытая для слухачоў, для маёй каманды — і мы заўсёды на адной хвалі. Гэта бясконцае задавальненне! Маё галоўнае жаданне — каб пасля канцэрта гледачы выходзілі натхнёныя, акрыленыя, поўныя яркіх эмоцый, з выдатным настроем. А мая сям'я падтрымлівала мяне пасля кожнага выступлення і радавалася маім поспехам!



**Надзея ЗУЕВА.**

# З неба зорачку дастану...

## Як зрабіць каханай небанальны падарунак на 8 Сакавіка?

**МІЖНАРОДНЫ жаночы дзень больш за стагоддзе таму вынайшлі нямецкія рэвалюцыянеркі Клара Цэткін і Роза Люксембург. Клара падала ідэю на II Міжнароднай канферэнцыі сацыялістак у Капенгагене ў 1910 годзе, а Роза падтрымала сяброўку. Дзякуй вам, дзяўчаты! Без штогадовага Жаночага дня пачатак вясны страціў бы львіную долю сваёй прывабнасці.**

Дзеля справядлівасці варта заўважыць, што першапачаткова свята было задумана як дзень яднання ўсіх жанчын свету ў барацьбе за свае правы, што і вынікае з яго першапачатковай назвы. Клара і Роза, спаўна зведаўшы крыўд ад мужчын, напэўна, не маглі не стаць феміністкамі. Вельмі ўжо ім не шанцавала ў асабістым жыцці...

Клара, дачка сельскага настаўніка, у канцы пазамінулага стагоддзя паехала вучыцца ў Лейпцыг. Там яе занесла на сход сацыял-дэмакратычнага гуртка, дзе выступаў эмігрант з Расіі Восіп Цэткін. Рамантычны арэол палітычнага выгнанніка надаваў яму зачаравання ў вачах васямнаццацігадовай дзяўчыны. Неўзабаве Восіпа арыштавалі і дэпартавалі з Германіі, але падчас арышту ён паспеў крыкнуць Клары, што кахае яе. У выніку ўсіх гэтых падзей дзяўчына стала, як цяпер сказалі б, грамадзянскай жонкай змагара за свабоду, роўнасць і братэрства. Шлюб яе выбраннік лічыў перажыткам буржуазнага мінулага, што не перашкаджала яму жыць за кошт Клары, якая вымушана была працаваць прачкай, даваць прыватныя ўрокі і займацца перакладамі, пакуль яе каханы пісаў заклікі. Так што Цэткін — гэта псеўданім, прозвішча Клары так і засталася дзявочым. Калі Восіп памёр ад сухотаў, Клара засталася з двума дзецьмі і без грошай, што і ў нашы дні нялёгка, не кажучы ўжо пра пачатак мінулага стагоддзя. Прыкладна тады лёс звёў яе з Розай, у якой таксама была асабістая драма. Разалія нарадзілася ў багатай сям'і, але была непрывабнай знешне, да таго ж яе псавала кульгавасць. Увагай мужчын дзяўчына не карысталася. Роза з'язджае вучыцца ў Варшаву і таксама захапляецца моднымі ў тыя часы сацыял-дэмакратычнымі ідэямі. Яна знаёміцца з палымяным рэвалюцыянерам, эмігрантам з Літвы Янам Тышкам і неўзабаве разумее, што не можа без яго жыць. Будучы моцнай натурай, Роза сама прызнаецца яму ў каханні і абяцае... кінуць рэвалюцыйную дзейнасць і стаць найлепшай на свеце жонкай. У адказ Ян толькі засмяяўся. Але час ад часу ён паблажліва сыходзіў да сваёй прыхільніцы, нічога ёй не абяцаючы. Каб пакончыць з гэтымі пакутлівымі адносінамі, Розе спатрэбілася больш за 15 гадоў рэўнасці і нязбыўных надзей... Мабыць, гэта тлумачыць, чаму, стаўшы адзінокімі, сяброўкі прысвяцілі сябе барацьбе за раўнапраўе палоў. Але ў нашы дні свята, што ўвекавечыла іх імёны, набыло зусім іншы сэнс. Цяпер 8 Сакавіка мы змагаемся не за права насіць штаны і праседжваць іх у офісе нароўні з мужчынамі, не за права нароўні з мужчынамі мяшаць цэментны раствор, вадзіць фуру або зарабляць на сям'ю. Не, у дзень барацьбы за свае правы мы спадзяёмся на знакі ўвагі, у гэты дзень мы лічым, што маем права атрымліваць падарункі проста за тое, што належым да прыгожага, не пабаюся гэтага слова, полу. І ў 25, і ў 65 мы хочам, каб наш адзіны запрасіў нас кудынебудзь на рамантычную вячэру. Ці хоць бы дома адкрыў віно і салату маянэзам заправіў. Бо, нягледзячы на перамогу ідэй Клары і Розы адносна роўнасці мужчын і жанчын, сёння нам хочацца лічыць мужчын моцным полам, верыць у іх, спадзявацца на іх надзейнае плячо і ўменне зрабіць жанчыну шчаслівай.

**У гэты дзень мы лічым, што маем права атрымліваць падарункі проста за тое, што належым да прыгожага, не пабаюся гэтага слова, полу.**

## ШТО ДАРЫЦЬ НЕ ТРЭБА

І вось тут мы падышлі да тэмы падарункаў на 8 Сакавіка. А пачнём, што называецца, «ад адваротнага».

• Вядома ж, 8 Сакавіка немагчыма без **кветак**. Здавалася б, універсальны знак увагі — як тут прамахнуцца? Але ў гэтым пытанні мноства «падводных камянёў». Перш за ўсё: гаворка наогул не ідзе пра мімозы ў рыпучай упакоўцы і пра чырвоныя гваздзікі. Але нават з цюльпанамі і ружамі лёгка прамахнуцца. У нашы дні наўрад ці жанчыну ўзрадуе набыты на касе ў прадуктовай краме букецік з трох сіратлівых цюльпанчыкаў. Ды і ружы бываюць розныя: калі вы сэканомілі на букеце (таму што «праз тыдзень ён усё роўна адправіцца ў смецніцу»), жанчына гэта абавязкова заўважыць. Што ж рабіць? Падысці да пытання з душой. Вось вы ведаеце, якія кветкі падабаюцца вашай каханай? Гэтае пытанне важна загадзя, няўзнак удакладніць. Можна пайсці іншым шляхам, як гаварыў яшчэ адзін знакаміты рэвалюцыянер. Выбраць букет згодна з фларыстычнымі тэндэнцыямі. Цяпер у модзе, напрыклад, «палявыя» букеты — адмыслова нядбайна складзеныя кампазіцыі розных кветак з зёлкамі, каласкамі і дэкаратыўным лісцем. Словам, у гэтым пытанні варта напружыцца — паверце, вам вернецца!



• Падарыць каханай **чароўнага коціка або мілага шчанюка** — таксама так сабе ідэя. Дарыць гадаванца варта, толькі калі жанчына недвухсэнсоўна выказала такое жаданне. І ў гэтым выпадку трэба ўважліва паставіцца да пажаданняў аб пародзе, афарбоўцы, узросце падарунка, а таксама аб тым, павінны гэта быць «хлопчык» або «дзяўчынка».

• **Парфума** — неадназначнае рашэнне. «Трапіць у яблычак» з такім падарункам пад сілу нямногім мужчынам. Выбар парфумы для жанчыны — пытанне глыбінных падсвядомых асацыяцый, пары года і нават настрою. Тое ж самае датычыцца адзення і абутку: калі вы не выбіраеце такі падарунак разам, хутчэй за ўсё гэта безнадзейны варыянт. І, вядома, тут важна ведаць не толькі густ каханай, але і яе дакладныя памеры. Упэўнены, што справіцеся?

• І ўжо зусім нічога не варты варыянт — **посуд.** Пара разарваць заганнае кола «шкарпэткі-бялізна на 23-га — букецік-патэльня на 8-га». Варыянт «бытавая тэхніка» крыху лепшы, але таксама не занадта ўдалы. Выключэнне — калі жанчына такі падарунак сама вам «замовіла». У іншым выпадку ўсе гэтыя патрэбныя ў гаспадарцы рэчы нагадваюць аб паўсядзённай руціне, пра якую ў Жаночы дзень жанчыне думаць зусім не хочацца. Наадварот, хоць бы на адзін дзень хочацца ўзняцца над «кухоннай абавязалаўкай», ператварыўшыся з Папялушкі ў прынцэсу. А тут вы са сваёй патэльняй!..

## ДЫК ЯКОЕ ВЫЙСЦЕ?

Перш за ўсё, прыняць валявое рашэнне не апускацца да «банальшчыны». І ўсвядоміць, што ў вас у арсенале — проста бязмежнае мора спосабаў парадаваць каханую. І пра гэта варта паразважаць. Жанчына заўсёды зразумее, купілі вы першае, што ўбачылі ў найбліжэйшай краме, або выбіралі і думалі. Такім чынам, 8 варыянтаў падарункаў на 8 Сакавіка — як адпраўная кропка для вашых разважанняў, дарагія мужчыны.

• **Упрыгожванне.** Згодна, не занадта арыгінальна. І ўсё ж якраз гэты, здавалася б, банальны варыянт на сёння можна заносіць у «Чырвоную кнігу» — настолькі рэдкім ён стаў. А яшчэ Мэрылін Манро казала, што найлепшыя сябры дзяўчат — гэта брыльянты. Не трэба разумець літаральна: брыльянты падарыць каханай па кішэні не многім. Але сёння ў ювелірных крамах безліч калекцый з серабра або біжутэрыі з сярэбраным напыленнем і крышталямі Свароўскі — яны не праб'юць надта вялікую дзірку ў вашым бюджэце. І зноў пагаджуся: выбар пярсцёнка патрабуе ведання дакладнага памеру пальчыка каханай. Але ж завушніцы або ланцужок з кулонам — універсальныя. Не варта выбіраць нешта экстраардынарнае, спыніцеся на класіцы.

• **Фітнес-бранзалет.** Сучасныя жанчыны хочуць быць прыгожымі, стройнымі і падцягнутымі ў любым узросце. Гаджэт дапамажа лічыць калорыі і пройдзеныя крокі, кантраляваць пульс і не забываць пра час. А яшчэ фітнес-бранзалеты выглядаюць вельмі стыльна — іх можна насіць нават проста як аксесуар.

• **Прыгожы набор для спецый або набор бакалаў.** Калі ўжо вельмі хочацца падарыць што-небудзь «для кухні», засяродзімся на тых рэчах, якія падкрэсліваюць вытанчанасць жанчыны і яе кулінарны талент. І яшчэ адна парада: упакоўка для любога падарунка — абавязковая. Падарунак ва ўпакоўцы заўсёды нясе ў сабе элемент інтрыгі, а прыемныя сюрпрызы дзяўчынкі любяць, колькі б гадоў ім ні споўнілася.

**Пара разарваць заганнае кола «шкарпэткі-бялізна на 23-га — букецік-патэльня на 8-га». Варыянт «бытавая тэхніка» крыху лепшы, але таксама не занадта ўдалы.**

• **Рамантычная вячэра.** Удакладненне: удваіх. «Чады і дамачадцы» на гэты вечар павінны быць заняты іншымі справамі. Можна арганізаваць тэт-а-тэт і дома, але ў гэтым выпадку (калі вы не замаўляеце ежу, а гатуеце самастойна) выбірайце адну нескладаную страву, якую, з аднаго боку, любіць яна, і з другога — вы ведаеце, што не сапсуеце. Кветкі, а таксама словы захаплення і кахання ідуць у абавязковым камплекце. Калі ж вы плануеце паход у рэстаран, лепш паведаміць пра гэта жанчыне загадзя, каб яна паспела «навесці прыгажосць».

• **Сертыфікат у якую-небудзь «жаночую» краму** — краму касметыкі, адзення або, скажам, салон прыгажосці. Таксама быццам бы не падыходзіць пад вызначэнне «небанальны падарунак», але рэдка прыходзіць мужчыне ў галаву. Калі вы выбіраеце гэты варыянт, не шкадуйце грошай —

**Вядома ж, 8 Сакавіка немагчыма без кветак. Здавалася б, універсальны знак увагі — як тут прамахнуцца? Але ў гэтым пытанні мноства «падводных камянёў».**

месяца павінна быць сапраўды добрым, а сума — дастатковай. А ў спа, дарэчы, можна ў якасці падарунка схадзіць удваіх: у спа-цэнтрах ёсць праграмы для пар. Нават калі вы ніколі такога не спрабавалі і наогул сябе там не ўяўляеце — пацярпіце дзеля каханай. У любым выпадку такі паход будзе незабыўны.

• **Сертыфікат у фірменны магазін ніжняй бялізны.** Гэты варыянт вылучым асобна. Так-так, бялізну мужчыну на 23-га дарыць не трэба, а вось жанчыне такі падарунак (сертыфікат, а не самі прадметы бялізны), хутчэй за ўсё, спадабаецца. Таму што, па розных прычынах, у паўсядзённым жыцці жанчыны часта адмаўляюць сабе ў куплі такіх вытанчаных камплектаў. Між тым прыгожая бялізна дапамагае жанчыне любога ўзросту адчуваць сябе чароўнай і жаданай.

• **Фотасесія.** Для яе або для вас абодвух. Як даніна захаплення яе прыгажосцю. Любая, нават самая ўпэўненая ў сабе прыгажуня час ад часу пачынае сумнявацца ў сваёй прывабнасці. Прафесійны фатограф падкрэсліць прыгажосць вашай каханай і створыць непаўторную прыгожую гісторыю.

• **Каханне і ўвага.** Так-так, гэтыя, здавалася б, няўлоўныя паняцці можна «ўвасобіць» у падарунак, калі выбраць яго з улікам менавіта яе захапленняў і хобі. Часцяком гэта прыгожы выхад з сітуацыі, у якой выбіраць падарунак даводзіцца ва ўмовах «фінансы спяваюць рамансы». Калі яна захапляецца ёгай, падыдзе арыгінальны дызайнерскі дыванок для заняткаў, калі шмат часу праводзіць за рулём — прыгожыя дробязі ў салон (напрыклад, «трымальнік» для тэлефона ў аўтамабіль), займаецца хэндмэйдам — выбар мілых аксесуараў для творчасці ў спецыялізаваных крамах велізарны. Галоўны пасыл такога «персаніфікаванага» падарунка — вы памятаеце пра тое, што яна любіць, вы ўважлівыя да яе інтарэсаў і, самае галоўнае, вам цікавая яна з яе багатым унутраным светам. Атрымаўшы такі падарунак, жанчына ў думках паставіць вам «плюс дзесяць да кармы». І ўзнагародзіць вашу чуласць пяшчотай і клопатам.

**Дзіяна РОНІНА.**

Дробязі (асабістага) жыцця

# ІГРАЙ, ГАРМОН!

## АХ, АПАЛОН...

Адна мая знаёмая сустракаецца з маладым чалавекам. Насамрэч маладым, бо яму 38, а ёй... Не, розніца ва ўзросце не такая істотная, як у Алы Барысаўны і вядомага гумарыста. І ўсё ж...

Нядаўна яна патэлефанавала і папрасіла парады... Маўляў, пайшла са сваім бойфрэндам у кавярню, зрабілі заказ, выпілі, расслабіліся... І яна (напэўна, ад вялікай дозы выпітага) вырашыла прызнацца яму ў пачуццях. Карацей, адкрыла рот і пачала: не магу без цябе жыць, не ўяўляю, як я існавала да гэтага, ты мой адзіны і г. д. І раптам, у самы кульмінацыйны момант гэтага душэўнага стрыптызу, ён падскоквае, пляскае сябе далоняй па лбе і з крыкам «Я забыўся закрыць машыну!» выносіцца з залы... І толькі праз 15 хвілін, упэўніўшыся, што ніхто не спакусіўся ні на адну запчастку яго дапатопнага «фальксвагена», вяртаецца ...

**Каханне — гэта не вывяржэнне вулкана, не перарэзаныя лязом вены, не вар'яцкі секс пасля бутэлькі тэкілы і ўжо ні ў якім разе не групавое наведванне душа.**

І ўсё гэта яна мне расказвае, бо адчувае: нешта тут не так. Ёсць нейкі падвох у паводзінах маладога чалавека. Але ці можна з гэтым мірыцца? Вось што непакоіць маю прыяцельку. І яна чакае адказу. А я што — суддзя? Ну, дапусцім, скажу ёй: «Пасылай яго падалей!» Яна паслухае і пашле, а сама пачне марнець і сохнуць, сохнуць і марнець...



Не, не пашле. Бо ў яго «гармон іграе», і ў гэтым плане ён задавальняе маю прыяцельку на ўсе сто працэнтаў. Яму нават звілінамі варушыць не трэба, каб прыдумаць, як і дзе з ёю сустрэцца. Не паспее ён сказаць «а», як яна дагаворвае ўвесь алфавіт, прычым хуценька, скорагаворкай. Глядзіць на яго як на грэчаскага бога («Ой, ён так складзены! Ты не ўяўляеш!») і пастаянна напружваецца па прычыне сваёй непаўнацэннасці.

«Ведаеш, — кажу ёй, — я тут у адным часопісе пра Растраповіча чытала, пра віяланчэліста...»

«Гэта такі страшненькі, лысы, з адтапыранай губой?» — перапытвае яна.

Ну, можа, і так, можа, і страшненькі. Калі паглядзець з аднаго боку. А з іншага... Яго кахалі выдатныя жанчыны свайго часу — нягледзячы на лысіну і неатлетычны целасклад. І не толькі за віртуознае валоданне смычком. Проста ён здольны быў на такі вар'яцкі жэст, так мог уразіць жанчыну, што ў яе не заставалася сіл супраціўляцца... Праважаючы ў непагадзь каханую дадому, мог, каб не абыходзіць за кіламетр лужыну, папросту скінуць з плячэй паліто і пасцяліць ёй пад ногі... Мог падарыць кошык ландышаў, а мог — вальс Штрауса ў незвычайным выкананні... Безумоўна, мог, скажаце вы — ён жа славутасць. Але ж, па-першае, хацеў! У выніку ў яго заўсёды былі самыя прыгожыя жанчыны, хоць знешне ён і не лічыўся Апалонам.

У Апалона, ведаеце, свае замашкі. Ён жа прывык, што да яго ўсе хочуць дакрануцца і ўжо адпаліравалі да бляску. А навошта вам мужчына, які 24 гадзіны ў суткі думае пра ўласную паліроўку? Ці пра паліроўку свайго аўто? Такі наўрад ці здзівіць ці ўразіць. І сваё паліто пашкадуе больш, чым вас.

Вам дастаўся менавіта такі экзэмляр? Ну, што ж, побач з жанчынай звычайна аказваецца той мужчына, якога яна заслугоўвае...

## РЭЎНАСЦЬ

У суботу Ніна прачынаецца рана. Надзявае сіні спартыўны касцюм з нашытымі на рукавах белымі палоскамі, залазіць на свой новы веласіпед і едзе ў магазін атаварвацца. Калі праз гадзіну вяртаецца, паходная сумка, якая па буднях служыць «дамскай», а па выхадных — гаспадарчай, аж трашчыць ад напружання, і ў ёй нешта загадкава пабрагвае...

Ніна асцярожна «прыпаркоўваецца» каля ўласнага плота, здымае з руля свой каштоўны груз і, злёгку кульгаючы, ідзе па цэментнай дарожцы ў бок хаты. Не даходзячы метры тры да дзвярэй, рэзка збочвае, каб схаваць у кустах бутэльку для будаўнікоў, якія перакрываюць дах.

Астатняе нясе ў хату — вечарам да іх запрошаны госці. Ну, не тое каб госці ў прыстойным сэнсе гэтага слова, а так, суседзі, Марыя з Раманам (былым армейскім афіцэрам, а зараз звычайным адстаўніком). У іх сем'ях такая завядзёнка — хадзіць адзін да аднаго па чарзе. Можна і без чаргі, калі ёсць што адзначыць. Сёння ж для сустрэчы мелася важкая падстава. «Абмыўкі» патрабаваў новы Нінчын веласіпед. Новы — не новы... Спачатку братава жонка, напэўна, з год развозіла на ім пошту. Аднак усё ж уламалі радню на «бартар» у выглядзе дзвюх скрынак дражджэй (балазе, Ніна працавала на дражджавым заводзе). Веласіпед быў ёй як нельга дарэчы. Ці да свекрыві ў вёску матануцца, ці ў краму, ці да сына на другі канец горада.

...Марыя з Раманам з'явіліся адразу пасля абеду — прынеслі з сабой дамашняй настойкі ў бутэльцы з-пад армянскага каньяку і колца пальцам піханай каўбасы. Ніна злазіла ў склеп па агуркі, насмажыла бульбы. Муж Пеця, які толькі прачнуўся пасля ўчарашняга, плюхнуўся на сваё любімае месца паміж сталом і газавай плітой. Ляніва пацікавіўся — з якой нагоды сабраліся? — і падазрона скасавурыўся на Рамана: нешта зачасціў ваяка. Можа, «жэрдка» яго худая яму надакучыла? Ніна, кульгаючы, бегала з кухні на веранду. «Бач, як стараецца! — прамільгнула ў галаве. — З чаго б гэта?»

**У Апалона, ведаеце, свае замашкі. Ён жа прывык, што да яго ўсе хочуць дакрануцца і ўжо адпаліравалі да бляску. А навошта вам мужчына, які 24 гадзіны ў суткі думае пра ўласную паліроўку?**

«Ну, за ваш ровар! Каб добра ездзіў!» — сказаў першы тост Раман. Усе выпілі, і ён вярнуўся да сваёй любімай тэмы — армейскіх успамінаў, пачаўшы на гэты раз так: «Калі я служыў у Ніжнім Тагіле, у жонкі нашага камандзіра таксама быў веласіпед. Дык яна на ім...»

Далей Пётр ужо нічога не чуў. Не абмежаваная ніякімі рамкамі фантазія, падагрэтая «знізу», малявала яму самыя фрывольныя сцэны з Нінчынага будучага жыцця: вось яна, кульгаючы на адну нагу, падыходзіць да веласіпеда, залазіць на яго, націскае на педалі і імчыць у напрамку найбліжэйшага бярэзніка. А там... Там яе ўжо чакае вусаты сусед у поўнай баявой выпраўцы.

«Ну, за каханне!» — прапануе наступны тост бравы адстаўнік Рома. Пётр павольна ўстае з-за стала. Хістаючыся, выходзіць у «бакоўку», дзе скіданы розныя патрэбныя ў гаспадарцы рэчы.

«Божухна, сякеру ўзяў! Навошта?» — шэпча Ніна. Заварожанымі позіркамі госці сочаць за Пятром. Ён размахваецца і... з усёй сілы наносіць удар. Спачатку — па багажніку, потым — па рулю, па колах... Спіцы разлятаюцца па зямлі, як іголкі. Ніна хоча падбегчы да мужа, Раман з Марыяй ледзь стрымліваюць яе. «Ды халера з ім, не лезь. Зараз супакоіцца, спаць ляжа. А веласіпед... Падумаеш — веласіпед! Не чалавек жа. Давай лепш вып'ем. Трэці тост — за жанчын!»

## ЛЁГКАСЦЬ БЫЦЦЯ

...Вечарам у нядзелю, стоячы ў чарзе ў касу крамы, міжволі выслухоўваю дыялог двух маладых людзей, на выгляд гадоў 16-17. «Ведаеш, — расказвае адзін, — ледзь трымаюся на нагах пасля бяссоннай ночы. Бацькі ўчора паехалі да бабулі, а я вырашыў скарыстацца момантам. Пазваніў Дашы, запрасіў у госці. Кажа, буду праз тры гадзіны. І што мне — тры гадзіны дарэмна губляць? Набраў Ксюху... Тая тачку па дарозе перахапіла і праз дзесяць хвілін прыехала... Ну, уключаю музычку, ідзём у душ... І тут — званок у дзверы. Накідваю прасціну і бягу адчыняць. А там — Дашка... Я — ёй: «Мілая, пагуляй з гадзінку, я пакуль заняты». Ледзь паспеў потым Ксюху выставіць. А Даша праз гадзіну вярнулася і да раніцы засталася».

«А чым усё скончылася з гэтай, як яе, з Алёнай? — пытаецца другі. — Яна ж рэальна была ў цябе закаханая!» — «Ды ты што! Я яе ўспамінаю як кашмарны сон. Прыкінь, два месяцы цягалася за мной, адвязацца не мог. А потым сказала, што цяжарная. Кожны дзень тэлефанавала, раўла... Я тады ледзь не пасівеў! Спаць не мог, рукі дрыжэлі ад жаху: а раптам бацькі даведаюцца? А потым проста паслаў яе, вельмі жорстка. З таго часу, дзякуй богу, не бачыў і не чуў. Не паверыш, пасля гэтага паўгода не мог на баб глядзець... Цяпер прэзервативы нават у школу з сабой бяру».

Яны абодва залівіста рагочуць.

Піва, аднак, «крутым пацанам» не адпускаюць па банальнай прычыне — недацягваюць па ўзросце. Пакуль яны — зусім па-дзіцячы — умольваюць касіра «ўнікнуць у становішча», я думаю пра віртуальную Алёну. З аднаго боку, яе, бедную, шкада. З іншага... Ну, напэўна ж, ведала, ад чаго «заводзяцца» дзеці. І не проста «заводзяцца», а праз дзевяць месяцаў з'яўляюцца на свет, не маючы нічога агульнага з лялькай Барбі, якую можна выкінуць, калі надакучыць. Дзіця — гэта нешта ўжо зусім рэальнае, не падобнае на ілюзіі, якімі забіты галовы 16-17-гадовых шукальніц прыгод. Чамусьці ў гэты перыяд жыцця побач з імі зачастую не аказваецца чалавека, здольнага далікатна растлумачыць, што каханне — гэта не вывяржэнне вулкана, не перарэзаныя лязом вены, не вар'яцкі секс пасля бутэлькі тэкілы і ўжо ні ў якім разе не групавое наведванне душа. Каханне не працуе на паказуху. Яно — маўклівае, кранальнае, шкадуючае і адданае. Гатовае несці адказнасць за ўсе наступствы. Нельга чакаць прынца — і адначасова аддавацца ўсім і кожнаму. Нельга марыць пра казку — і пагарджаць элементарнымі нормамі маралі.

Адна знаёмая мама дзяўчынкі-падлетка неяк заўважыла: «Нічога... Да васямнаццаці перашалеюць, а потым зоймуцца сур'ёзнымі справамі».

**Далей Пётр ужо нічога не чуў. Не абмежаваная ніякімі рамкамі фантазія, падагрэтая «знізу», малявала яму самыя фрывольныя сцэны з Нінчынага будучага жыцця.**

Гэта, канешне, абсалютная праўда. Перашалеюць. Наядуцца «забароннага плоду». Набудуць сякі-такі «дарослы» вопыт, каб было чым перад сябрамі бліснуць. Пратопчуць дарожку да гінеколага і венеролага. Займеюць букет недалечаных хвароб, якія будуць перыядычна нагадваць аб сабе. Зробяць па адным-два «вакуумы». І супакояцца... Пачнуць прынцаў і прынцэс чакаць. Каб усё было, як у нармальных людзей: дом, сям'я, дзеці...

Нядаўна яшчэ адна мама выдавала замуж 18-гадовую дачку. Малады быў хоць куды: і прыгожы, і багаты, і з прыстойнай сям'і. Ды толькі вось незадача: нявеста «застукала» яго з іншай, заспела, што называецца, на гарачым. Акурат за тыдзень да вяселля. На сямейным савеце «грэх» будучаму зяцю вырашылі дараваць. А куды падзецца, калі сама нявеста — на чацвёртым месяцы цяжарнасці? Ды і запрашэнні на вяселле разасланыя, і рэстаран заказаны, і сукенка са шлейфам...

Пра што гэта я? Ды так, пра жаночую годнасць. Не пра тую, што ў падручніках па анатоміі. А пра тую, аб якой нашы прабабулі расказвалі бабулям, а бабулі — маці. Якую нельга страціць, а можна толькі мець ці не мець. Каштоўнасць гэта невялікая, але дарагая. У тым сэнсе, што адсутнасць яе дорага абыходзіцца.

Хоць, магчыма, я памыляюся, і ніякай жаночай годнасці ўвогуле не існуе. Ні жаночай, ні мужчынскай. А ёсць толькі «лёгкасць быцця». Спачатку такая невыказная, а потым — такая невыносная.

**Наталля УЛАДЗІМІРАВА.**

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена без НДС на основании п. 1.33. ст. 118 Налогового кодекса Республики Беларусь, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. номером 631/С-59381 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, площадь – 64,3 кв. м). Составные части и принадлежности: одноэтажный блочный оштукатуренный жилой дом с верандой | Минская обл., Вилейский р-н, Осиповичский с/с, д. Осиповичи, ул. Центральная, 75 | 26 000,00 | 2600,00 | 1300,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. номером 631/С-59389 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, площадь 70,1 кв. м). Составные части и принадлежности: одноэтажный блочный оштукатуренный жилой дом с холодной пристройкой, сараем | Минская обл., Вилейский р-н, Осиповичский с/с, д. Осиповичи, ул. Центральная, 82 | 29 900,00 | 2990,00 | 1495,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. номером 631/С-58551 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, площадь 70,7 кв. м). Составные части и принадлежности: одноэтажный сборно-щитовой, облицованный «Сайдингом», жилой дом с холодной пристройкой | Минская обл., Вилейский р-н, Осиповичский с/с, д. Илищевичи, 87 | 17 700,00 | 1770,00 | 885,00 |

В отношении лотов №№ 1–3 проводятся первые торги

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 621385408101000162 для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), пл. – 0,2091 га. Право аренды. Лот № 2 расположен на земельном участке с кадастровым номером 621385408101000156 для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), пл. – 0,1351 га. Право аренды. Лот № 3 расположен на земельном участке с кадастровым номером 621385404101000068 для размещения объектов усадебной застройки (для обслуживания жилого дома), пл. – 0,1336 га. Право аренды

Ограничения (обременения) в отношении лотов: ограничения (обременения) прав на капитальные строения (ипотека) в отношении лотов №№ 1–3. В соответствии с п. 1 ст. 15 Закона Республики Беларусь от 20.06.2008 № 345-З «Об ипотеке» ипотека в силу реализации имущества с публичных торгов будет прекращена с момента продажи имущества посредством публичных торгов в форме открытого аукциона.
Ограничения (обременения) в отношении земельных участков лотов: виды ограничений (обременений) прав: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадь 0,0145 га (в отношении лота № 1)

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **4 апреля 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 2 марта 2023 года до 16.00 31 марта 2023 года** |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «Вилейский райагросервис», проводимых 04.04.2023.
2. Заявление на участие от граждан (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. Оплата цены жилого помещения осуществляется:
4.1. в рассрочку на двадцать лет без индексации платежей и внесения первоначального взноса ежемесячно равными долями:
работниками сельскохозяйственных организаций, организаций социально-культурной сферы, потребительской кооперации, постоянно проживающими и работающими в населенных пунктах с численностью населения до 20 тыс. человек, а также уволенными из этих организаций по основаниям, не предусмотренным в абзаце втором части второй пункта 5 Указа Президента Республики Беларусь от 17 июня 2011 г. № 253 «Об отдельных вопросах купли-продажи жилых домов (квартир) сельскохозяйственных организаций»;
лицами рядового и начальствующего состава органов внутренних дел, постоянно проживающими и работающими в населенных пунктах с численностью населения до 20 тыс. человек, а также уволенными со службы из этих органов в запас или отставку по основаниям, не предусмотренным в абзаце третьем части второй пункта 5 Указа Президента Республики Беларусь от 17 июня 2011 г. № 253 «Об отдельных вопросах купли-продажи жилых домов (квартир) сельскохозяйственных организаций»;
4.2. в рассрочку на три года без индексации платежей и внесения первоначального взноса ежемесячно равными долями – иными гражданами.
5. Сумма задолженности за приобретенное жилое помещение подлежит оплате равными долями ежемесячно без индексации платежей в течение трех лет с даты увольнения (за исключением увольнения из сельскохозяйственных организаций, иных юридических лиц, находящихся в процедуре ликвидационного производства):
5.1. работников сельскохозяйственных организаций, организаций социально-культурной сферы, потребительской кооперации по основаниям, признаваемым дискредитирующими обстоятельствами увольнения согласно Декрету Президента Республики, Беларусь от 15 декабря 2014 г. № 5 «Об усилении требований к руководящим кадрам и работникам организаций», а также по основаниям, указанным в пунктах 1, 2 и 4 <*> части второй статьи 35, статье 40 <**> и пункте 4 статьи 42 Трудового кодекса Республики Беларусь;
<*> За исключением увольнения из сельскохозяйственной организации, включенной в перечень сельскохозяйственных организаций, подлежащих досудебному оздоровлению, в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 4 июля 2016 г. № 253.
<**> Кроме увольнения при наличии обстоятельств, исключающих или значительно затрудняющих продолжение работы (состояние здоровья, достижение общеустановленного пенсионного возраста, радиоактивное загрязнение территории и другое), а также в случаях нарушения нанимателем законодательства о труде, коллективного договора, соглашения, трудового договора;
5.2. лиц рядового и начальствующего состава органов внутренних дел по основаниям, указанным в подпунктах 179.2, 179.5, 179.6 пункта 179, подпунктах 180.2 – 180.4, 180.6, 180.7 пункта 180 Положения о прохождении службы в органах внутренних дел Республики Беларусь, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 15 марта 2012 г. № 133 «О вопросах прохождения службы в органах внутренних дел Республики Беларусь».
6. Покупатель вправе оплатить стоимость приобретаемого жилого помещения досрочно.
7. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
8. При признании аукциона несостоявшимся, а также отказе единственного участника аукциона от приобретения жилого помещения по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов, будут произведены повторные аукционы по продаже жилого помещения с понижающим шагом аукциона в 10 процентов от начальной цены продажи.
9. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
**Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов.**
